Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І ЎПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 23 (437) | Нядзеля, 11 чэрвеня 1939 года | Цана 20 кап.

ВУЧЫЦЦА У ГОРКАГА

Каштоўнасць мастацтва вымяраецца не колькасцю, а якасцю,—указваў А. М. Горкі. Толькі ідэйна-значныя, мастацка-спелыя, жыццёва-праўдзівыя творы даходзяць да сэрца чытача, хвалююць і натхняюць, вучаць і выхоўваюць яго. І такімі творамі павінна ўзбагачацца наша літаратура, вырашаючы адказнейшыя задачы комуністычнага выхавання працоўных. Змагацца за ўздым якасці, ідэйнай і мастацкай вартасці сваіх твораў—абавязак совецкіх літаратараў.

Наша літаратура няспынна ўзбагачаецца новымі творамі паэзіі, прозы, драматургіі. Але трэба сказаць, што не ўсе з іх здольны па-сапраўднаму задаволіць патрабаванні чытача. Элементы штампу і схематызму, абмежаванасць мастацкіх сродкаў уласцівы нават лепшым творам нашай літаратуры. І наша крытыка часамусці вельмі прымірэнча ставіцца да гэтага.

Нельга забываць праўдзівай думкі Аляксея Максімавіча, якая была выказана ім на першым з'ездзе совецкіх пісьменнікаў: «Творчасць—гэта тая ступень напружання работы памяці, калі хуткасць яе работы бярэ з запасу ведаў, уражанняў найбольш выпуклыя і характэрныя факты, малюнкі, дэталі і ўключае іх у найбольш дакладныя, яркія, агульназразумелыя словы. Маладая наша літаратура не можа пахваліцца гэтай якасцю. Запас уражанняў, колькасць ведаў нашых літаратараў невялікія і асаблівага клопату аб пашырэнні, паглыбленні іх не адчуваецца».

Патрабавальны да сябе, вялікі майстар літаратуры быў патрабавальным і да іншых. І трэба вучыцца гэтай патрабавальнасці, прынцыповасці, майстэрству ў Горкага.

Нават першымі сваімі творамі А. М. Горкі зарэкамендаваў сябе, як выдатны майстар, які валодае «сакрэтам» сапраўднага мастацтва. «Вы,—гаварыў Горкаму В. Караленка, азнаёміўшыся з апавяданнем «Чэлкаш»,—можаце ствараць характары, людзі гавораць і дзейнічаюць у вас ад сябе, ад сваёй сутнасці, вы ўмееце не ўмешвацца ў цячэнне іх мыслі, ігру пачуццяў, гэта не кожнаму даецца! А самае галоўнае ў гэтым тое, што вы цэніце чалавека такім, якім ён ёсць. Я-ж гаварыў вам, што вы рэаліст!»

Горкі, які «моцна звязаў сябе сваімі вялікімі мастацкімі творамі з рабочым рухам Расіі і ўсяго свету» (Ленін), сваім магутным талентам стварыў выдатнейшую галерэю класічных па праўдзівасці і мастацкай выразнасці вобразаў.

Прадстаўнікі люмпен-пролетарыята, былога расійскага «дна», буржуа і мяшчане, буржуазныя інтэлігенты тыпа Кліма Самгіна, маці маладога рабочага-рэвалюцыянера Нілаўна, прадстаўнікі рабочага класа,—усе гэтыя горкаўскія вобразы здзіўляюць шырынёй абагульнення, тыповасцю і разам з тым арыгінальнасцю, непаўторнасцю характараў.

Ад глыбокага ведання і разумення жыцця, ад вялікай любві да працы і працоўнага чалавека ішоў А. М. Горкі, ствараючы вобразы сваіх твораў. Жыццёвая праўда ляжыць у аснове раскрыцця ўнутранага свету герояў твораў Горкага. Яны адухоўлены шчырасцю і любоўю мастака.

Бессмяротны вобраз гераіні аповесці «Маці»—Нілаўны! Гэта адзін з выдатнейшых вобразаў усёй сусветнай літаратуры. Проста і праўдзіва, як у сапраўднасці—у жыцці, развіваецца ён. Любоў маці да сына-рэвалюцыянера перарастае у адданасць яе рэвалюцыі. І кожная дэталь, кожнае слова раскрывае працэс гэтага росту класавага самаўсведамлення героя. Колькі назіральнасці, сілы і прастаты ў творы. І заслужана аповесць «Маці», якая, як адзначыў Ленін, прынесла вялікую карысць рабочаму руху, была «вельмі своечасовай кнігай» і зараз з'яўляецца любімейшым творам працоўных не толькі нашай краіны, але і ўсяго свету.

Совецкім літаратарам трэба вучыцца майстэрству ў вялікага Горкага, каб з гонарам вырашыць задачу паказу «працэса развіцця новага, совецкага грамадзяніна» (Горкі).

Страснай любві да жыцця, да працоўнага чалавека — асноўнага героя нашай літаратуры, майстэрству стварэння тыповых вобразаў эпохі, раскрыцця ўсёй складанасці характараў людзей, уменню знаходзіць найбольш простыя і выразныя моўныя сродкі трэба вучыцца нашым літаратарам у Горкага.

Верны сын нашага вялікага народа, друг Леніна і Сталіна, пролетарскі гуманіст і страсны змагар за шчасце працоўнага чалавецтва, за комунізм, А. М. Горкі асабістым прыкладам, сваёй творчасцю вучыць і натхняе совецкіх літаратараў.

Вучыцца ў Горкага—значыць змагацца за высокую ідэйную і мастацкую якасць нашай літаратуры.

НОВЫЯ ТВОРЫ

Ілья ГУРСКІ

ПАТРЫЁТЫ

Урывак з п'есы

★

Былы маёнтак пана Дварэцкага, цяпер калгасны клуб. На дзвярах надпіс: «З прычыны ранення выканаўца ролі караля—пастуха калгаса «Праўда» Пятро Севасцянавіча Руднева, спектакль «Кароль Рычард III» пераносіцца на 11 ліпеня 1937 года. Білеты сапраўдны». Далёка ў глыбіню працягнуліся алеі. Многа зелені, кветак. Чыстата, прастор. Аксіння з Сасноўскім прагульваліся, потым селі на скамейку.

САСНОЎСКІ (прадаўжае гаварыць). Не магу! Кашмары. З трох гадзін ночы аж да раніцы не спаў.

АКСІННЯ. Я вам веру. Хіба ў вас магла падняцца рука на Цімоха? Ніколі.

САСНОЎСКІ. Аксінюшка! (Глядзяць у вочы адзін другому). Верыш? (Панура). А я хацеў было рукі накласці.

АКСІННЯ. Неразумна (усміхнуўшыся). Тады-б я перастала вас любіць.

САСНОЎСКІ. Любіш? Дык як-жа будзе? Без цябе я жыць не магу.

АКСІННЯ. Запытаюся ў бацькоў. (Паднялася). Хутка народ пачне сабірацца, а я не ведаю, што гаварыць. Столькі ўражанняў ад Масквы.

САСНОЎСКІ. Я цябе правяду.

АКСІННЯ. Не. Унь Домна. Яна мне патрэбна. Будзем бачыцца.

Сасноўскі пайшоў.

ДОМНА (падышоўшы). Анісіма майго не бачыла?

АКСІННЯ. Не.

ДОМНА. Ну, мала не будзе.

АКСІННЯ. Кажаш, учора ў Пекарскай быў Ліхадзіеўскі?

ДОМНА. Так. Доўга аб нечым гаварылі.

АКСІННЯ. Сёння яго няма. Забралі. Аказваецца, коні — здаровыя.

ДОМНА. Здаровыя? Брава, Аксіння.

АКСІННЯ. Вось што, не спускай вачэй з Пекарскай. Аб сустрэчы яе з Трутневым раскажы Сасноўскаму. Я яе выведу на чыстую ваду. (Ідучы). Трэба... (Аб нечым ціха гаворачь).

Праз некаторы час Анісім з Домнаю ідуць пад-руку.

ДОМНА (глядзіць на аб'яву). Анісім! Шпектакль будзе?

АНІСІМ (рэзка). Няўжо, мая Домначка, ты не бачыш? Спектакль адмяняецца.

ДОМНА. Я няграматная.

АНІСІМ. Чым пахвалілася!? Пасаромілася-б людзей. Адна ў калгасе засталася такой. За гэта цяпер б'юць.

ДОМНА (грозна). Што-с?

АНІСІМ (напалохана). Я пажартаваў.

ДОМНА. Добрыя жарты?! Б'юць!? (Лезе з кулакамі).

АНІСІМ. Перастань!

ДОМНА. Можа, любіць кінеш?!

АНІСІМ. А што ты думаеш! Няграматнасць, гэта тормаз...

ДОМНА. Ну, і правальвай! Бачылі такіх. Другога палюбім.

АНІСІМ. У асноўным, мая ты каралева, я цябе люблю.

ДОМНА. Як, у асноўным? А ты-ж казаў: на ўсе сто процантаў. Я ўся гару ад злосці. Кулінар!

АНІСІМ. Ты мне кулінарыю не чапай. Гэта табе, можа, не цялят паіць.

ДОМНА. Ах, ах, які спец!

АНІСІМ. Каўбасу ела—ела. Век такой не зробіш, хоць і ў гадох дзяўчына.

ДОМНА. Вось яно як! Нянька! А памятаеш, як ты салаўём заліваўся. Усё раманцы, ці як іх, спяваў. Як-жа ён? Ага! «Любви все возрасты покорны». А цяпер аглоблі назад? Кулінар!

АНІСІМ. Домна Янкаўна! Колькі разоў я вас прасіў, не чапайце маёй кулінарыі. Скажыце, няўжо і гарох быў нясмачны?

ДОМНА (скрывілася). У рот нельга было ўзяць.

АНІСІМ. А сама на сто процантаў апляла.

ДОМНА. Гэта вам здалося. Палавіна трэцяга бачка—засталася. (Наступаючы). Вы што-ж гэта, народнае дабро расцягваеце? З казённага катла цывільных корміце?

АНІСІМ. Ну, і што тут такога! Мне старшы лейтэнант дазволіў. А ў вашага цяляці горб расце.

ДОМНА. У якога?

АНІСІМ. У падласага бычка «Рычарда III».

ДОМНА. Ён зроду быў такім.

АНІСІМ. Ну, значыць карову не дагледзелі. Усюды патрэбна грамата.

ДОМНА. Ну, добра, казёл ты рыжы! Паскачаш у мяне. Гэта грамата табе бокам вылезе.

АНІСІМ. Домна Янкаўна! Я вас люблю.

ДОМНА (перабівае). Як чорт свечку...

АНІСІМ. Яшчэ горш!

ДОМНА. «У гадох дзяўчына»! Страшна ты мяне пакрыўдзіў, Анісім. Я табе за гэта ніколі не дарую! Людзі ў героі павыбіваліся, а ён на кухні аціраецца.

АНІСІМ. Зноў кухня! Прыдзецца, відаць, у лётчыкі падавацца.

ДОМНА. Ён будзе лётчыкам!? Нікуды я цябе не пушчу!

САСНОЎСКІ (падышоўшы). У чым справа? Што за скандал!

ДОМНА. Ніякага скандалу, звычайная сямейная сцэна, таварыш малодшы палітрук. Анісім, пражыўшы са мною год, дзяўчынаю заве, у зубы заглядае. Падлічвае, колькі мне год адстукала.

САСНОЎСКІ. А-а-а. Наступіў на жаночы мазоль.

ДОМНА. Каб вы ведалі, як баліць. (Да Анісіма). Кулінар!

АНІСІМ. Колькі разоў я цябе прасіў, не чапай кулінарыю.

ДОМНА. Кулінар, кулінар, кулінар!

АНІСІМ. Домна Янкаўна!

ДОМНА. Домна Янкаўна—трыццаць адзін год.

АНІСІМ. Трыццаць два... з гакам.

ДОМНА. Колькі таго гаку і столькі гаворкі. Кулінар!

АНІСІМ. Кулінар, і гэтым ганаруся.

ДОМНА. А я ганаруся, што столькі пражыла.

САСНОЎСКІ. Значыць, мір?

ДОМНА. Няхай перапросіць.

АНІСІМ. Прабач, Домна Янкаўна. Толькі больш не чапай кулінарыю.

ДОМНА. А ты не падлічвай маіх год, яны і так бягуць. Падумаеш, «дзяўчына ў гадох». Я табе ніколі гэтага не дарую. (Лезе з кулакамі). Кулінар!

САСНОЎСКІ (хітра). Калі так, прыдзецца вас разлучыць. Анісіма перавядзем у другі атрад.

ДОМНА. Што-о? Новае дзела! Нікуды Анісіма я не адпушчу ад сябе.

САСНОЎСКІ. Тады мірыцеся.

ДОМНА. Будзьце ўпэўнены, памірымся. (Абняла Анісіма).

АНІСІМ. О-ой! Домначка, я жыць хачу.

ДОМНА. Папаўся кулінар у мае рукі. Прасіся!

САСНОЎСКІ. Ну, і пара! Арыгіналы!

ДОМНА. Прасіся.

АНІСІМ. Домна Янкаўна! Прабач, я пагарачыўся.

ДОМНА. Прабач і ты мяне, Анісім. Я таксама падгарачылася. Значыць, мір?

АНІСІМ. На ўсе сто процантаў.

САСНОЎСКІ. Ну, і добра. Домна Янкаўна! Вы нешта хацелі мне сказаць?

ДОМНА. Анісіма не будзеце пераводзіць?

САСНОЎСКІ. Не.

ДОМНА. Тады скажу. Пекарская ўсё распытвала пра вас. Сцеражыцеся яе, як агню. Гэта жанчына ходзіць з каменем за пазухай. Байкач каля яе трэцца. Надоечы прыязджаў да яе Трутнеў. Усё гэта не спраста робіцца.

САСНОЎСКІ. Жанчына—агонь?!

ДОМНА. Цьфу! Балота! Будзь я на месцы мужчыны, і ў той-бы бок не глянула. Скажыце, чаго вы зачасцілі ў калгас?

АНІСІМ. Не ведае.—да Аксінні.

ДОМНА. О, гэта другая справа. Аксіння—дачка граніцы. Яна ведае кожную сцежку ў лесе. Сёлета затрымала чатырох парушальнікаў. Гэта будзе добрая жонка і таварыш.

САСНОЎСКІ. Аксіння ніяк не забудзе Цімоха.

ДОМНА. Выплакала вочы па ім. Гэта дзяўчына ўмее любіць і ненавідзець. А як яна?

САСНОЎСКІ. «Запытаю,—кажа, — у бацькоў».

ДОМНА. Яна Станкевічаў бацькамі лічыць. І правільна робіць. Немцы расстралялі яе бацькоў. Станкевічы знайшлі яе поўмёртвай. Дзіцяці прастрэлілі грудзі. Да трыццатага года Аксіння жыла ў сям'і Станкевічаў, як дачка. А потым калгас пабудаваў ёй хату. Слаўныя ў Аксінні бацькі. Яны вас зразумеюць. А Байкач і на вас і на Ваяводзіна нахлусіў.

САСНОЎСКІ. Адкуль вы ведаеце пра заяву Байкача?

ДОМНА. Чуткамі зямля поўніцца.

САСНОЎСКІ (Да Анісіма). Ваша работа?

АНІСІМ (паціскае плячыма). Першы раз чую.

ДОМНА. Байкач сам пра гэта гаворыць. Тут ён паказаў сваё солтысава нутро.

САСНОЎСКІ. Солтысава?

ДОМНА. Яго бацька быў солтысам. Ага! А пра самае галоўнае чуць не забылася. Калі быў Трутнеў у Пекарскай, то гаварыў, што пытанне аб адкрыцці граніцы не здымаецца. Ён на чым свет стаіць лаяў вас і Ваяводзіна, потым сказаў, што абодвух прыбярэ.

САСНОЎСКІ. Аб адкрыцці граніцы? Вы напішаце аб гэтым?

ДОМНА. Можна. Толькі... Прабачце, я няграматная.

АНІСІМ. Ага! Што я табе казаў? Каб табе грамата—міравая жанчына!

САСНОЎСКІ (дастаў блакнот). Я ўсё гэта, аб чым вы мне гаварылі, запішу. Падпісацца ўмееце?

ДОМНА. Яшчэ як! Анісім навучыў крэндзелі выводзіць.

САСНОЎСКІ. Дзе вы гэта чулі?

ДОМНА. Яны прагульваліся каля балотца. Колькі страху набралася, калі яны зайшлі ў каноплі. Потым падышла машына.

САСНОЎСКІ. Та-а-ак. (Дае блакнот).

ДОМНА (падпісаўшыся). Домна Міцкевіч. Міністэрскі подпіс. Толькі казначэйскія білеты падпісваць. (Пауза). Вось і яна, ведзьма гэта. (Неўзабаве падыходзіць Пекарская і Байкач з гітарай).

ПЕКАРСКАЯ (паглядзела на аб'яву) Якое няшчасце, Руднева паранілі...

АНІСІМ. На вас гэтага не відаць.

ПЕКАРСКАЯ. Фі! Вы не ўмееце абыходзіцца з жанчынай. (Да Сасноўскага). Добры дзень!

САСНОЎСКІ. Дзень добры! (Па адной з алей ідзе Аксіння).

ДОМНА. Аксіння! (Усе глядзяць на яе, наперад выходзіць Сасноўскі).

ПЕКАРСКАЯ. Што гэта ў яе? Ордэн?

БАЙКАЧ. Так. Ордэн «Працоўнага Чырвонага Сцяга».

ПЕКАРСКАЯ. Што ў ёй знаходзяць прыгожага? Звычайная вясковая чырвонашчокая дзяўчына. А колькі гонару, велічы! Фэ!

БАЙКАЧ. Фэ!

САСНОЎСКІ (бярэ пад-руку Аксінню). Падрыхтавалася?

АКСІННЯ (станоўча кіўнула галавою).

ПЕКАРСКАЯ (да Байкача). Ці не думае толькі Сасноўскі на ёй жаніцца?

БАЙКАЧ. Няўжо-ж.

ПЕКАРСКАЯ. Не паспела аднаго пахаваць, як другога завяла. Як гэта проста ў іх робіцца.

БАЙКАЧ. І проста, і складана. Сасноўскі даўно яе любіў, але Гладкіх не даваў ходу. І ўсё-ж—яна прыгожая.

ПЕКАРСКАЯ. Я думаю, кожную раніцу калгасны сырадой п'ючы.

БАЙКАЧ. Алё! Падам сігнальчык.

ПЕКАРСКАЯ. Дзіву даешся, адкуль у такой простай дзяўчыны столькі ўпэўненасці, велічы. Як трымае сябе!

Падыходзяць мужчыны, жанчыны, Станкевіч Ціт і Наста, Руднеў з перавязанай галавой. Па адной алеі ідуць пагранічнікі з дзяўчатамі. Іграе гармонік.

ЦІТ (увайшоўшы на ганак клуба). Таварышы! У нас сёння павінен быў адбыцца спектакль, але з тае прычыны, што паранілі Руднева, спектакль адмяняецца. Паслухаем Аксінню аб паездцы ў Маскву. (Воплескі).

АКСІННЯ (увайшоўшы на ганак). Цяжка мне перадаць вам адчутае і перажытае за гэтыя дні. Слоў нехапае. Мне пашчаслівілася быць у Маскве, убачыць таварыша Сталіна, гаварыць з ім. Таварыш Сталін мне руку паціснуў. Расказала я пра калгас, пра вас усіх. Цікавіўся кожным чалавекам. Пытаўся пра граніцу. Аказваецца, ворагі хацелі граніцу адкрыць і цяпер яшчэ не пакідаюць надзеі. Я сказала, што покуль мы (абводзіць усіх вачыма), пагранічнікі, жывыя—гэтага ніколі не будзе.

ГАЛАСЫ. Правільна! Правільна! Правільна!

АКСІННЯ. Яшчэ таварыш Сталін пытаўся, хто мае бацькі. Як я жыву. Расказала я яму пра ўсё. Як некалі немцы, палякі білі нас, як яны забілі маіх бацькоў і мяне ранілі. Таварыш Сталін сказаў, што больш ніколі і нікому не давядзецца нас біць. Мы будзем біць тых, хто асмеліцца на нас пайсці, будзем біць смяротным агнём. (Воплескі). І яшчэ я сказала, што днямі выходжу замуж за пагранічніка, Цімоха Гладкіх. Прасіла прыехаць на вяселле. Усё сказала. Таварышу Сталіну нельга не сказаць. Ён усё ведае. А як ён любіць беларусаў! Казаў, у грамадзянскую вайну беларускія сяляне апошнім дзяліліся з чырвонаармейцамі. Адно-ж, прыязджаю—не застаю Цімоха. У рэчны вада атручана. Жарабок, якога Чырвонай Арміі ў падарунак гадавалі, загінуў. Шасцярых коней хацелі забіць. Руднеў паранен. Таварыш Сталін прасіў пісаць яму аб усім. Я сёння паслала яму пісьмо. Пра ўсё напісала, як роднаму бацьку.

ДОМНА. І пра мяне таварыш Сталін пытаўся?

АКСІННЯ. Я сама яму сказала, што ты ў нас у калгасе апошняя няграматная.

АНІСІМ. Ага! Даскакалася!

АКСІННЯ. Усім нам дасталося за цябе, але больш за ўсё Анісіму. У міравога повара жонка няграматная.

ДОМНА. Ага! Паскачаш і ты! (Да Аксінні). Колькі трэба, каб навучыцца грамаце?

АКСІННЯ. Я цябе навучыла-б за тры месяцы чытаць і пісаць.

ДОМНА. Добра. (Да Анісіма). Тры месяцы не лезь з пацалункамі. Я цябе праўчу! Даю слова перад народам, што праз тры месяцы буду граматнай.

АКСІННЯ (пасля паўзы). Сталін! Колькі я з ім пагаварыла і на цэлую галаву вырасла. «Ведаеце,—кажу я таварышу Сталіну,—як прыеду дадому, раскажу ўсяму народу пра вас». А таварыш Сталін вазьмі і запытайся: «Што-ж вы пра мяне скажаце?» А ў мяне і слоў няма. Тады таварыш Сталін усміхнуўся і гаворыць: «Скажаце, што бачыла таварыша Сталіна. Ён такі звычайны...» Я тады кажу: «Гэта праўда, але не ўся. Сталін!— гэта сонца, якое ніколі не згасне, покуль будзе жыць чалавек».

НАСТА. Малайчына Аксіння! (Воплескі).

АКСІННЯ (падумаўшы). Вось што, мужчыны і жанчыны. Да нас у хату забраўся ліхі чалавек. Чым хутчэй мы яго выявім, тым менш ён прынясе пакут.

НАСТА. Каб-жа ведаў хто?

САСНОЎСКІ. Быць не можа, матуля,— знойдзем.

ЦІТ. І я гэтак мяркую. Калі дружна ўзяцца, разблытаем клубок.

АКСІННЯ (з нейкай асаблівай унутранай цеплынёй). Сталін! Пагаварыўшы з ім адзін раз, цягне ў другі раз сустрэцца. Аднойчы пайшоўшы за Сталіным, на век з ім звяжаш свой лёс. Я прасіла таварыша Сталіна дапамагчы нам разабрацца. А калі таварыш Сталін возьмецца за што, то навядзе парадак. Слава таварышу Сталіну!

Воплескі. Анісім зайграў. Танцуюць танец пагранічнікаў, да іх далучаюцца Аксіння з Сасноўскім, потым Ціт з Настай.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

Гэтымі днямі адбыўся чарговы Пленум ЦК КП(б) Беларусі з удзелам сакратароў абкомаў, гаркомаў і райкомаў партыі.

Пленум абмеркаваў пытанні:

а) Аб мерапрыемствах па выкананню пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР ад 27 мая 1939 г. „Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання“.

б) Аб ссяленні двароў калгаснікаў, пражываючых на былых участках хутарского землекарыстання, у калгасныя сяленні.

в) Аб падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю і загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў у 1939 годзе.

г) Аб парушэнні некаторымі пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі і райкомамі КП(б) Беларусі ленінска-сталінскага прынцыпа індывідуальнага адбору ў партыю.

Па ўсіх гэтых пытаннях Пленум прыняў адпаведныя рашэнні.

Пленум выбраў сакратаром ЦК КП(б) Беларусі па кадрах таварыша ЖЫЛЯНІНА Якіма Аляксандравіча і сакратаром ЦК КП(б) Беларусі па прапагандзе і агітацыі таварыша МАЛІНА Владзіміра Ніхіфаравіча.



Праект помніка А. М. Горкаму работы народнага мастака Грузі ордэнаносца Я. Нікаладзе. Фотахроніка ТАСС.

ЯКУБ КОЛАС

НА УСХОДЗЕ СОНЦА

Выплывае круг агністы
З груды мутных хмар.
Па-над рэчкай дуб вячысты
Не схісне ніводным лістам,
Стаў, нібы ўладар.
На яго шацёр-карону
Пурпур лёг зары.
У прасветы хмар заслоны
Сыпле сонца стрэл мільёны,
Шле зямлі дары.
Над нізінай нерухомы
Звіс, як дым, туман.
Цераз нетры, бураломы
Сцеле белыя паромы
З лугу да палян.
Звонка граюць струны цішы
На ўсе галасы.
Дрэмле ветрык і на ўзвышшы
Нават кветкі не калыша,
Не страсе расы.
Дзень свой рэй вядзе ў калгасе,—
Гоман, скрып і грук.
Дзесь у лесе на папасе
Забалбоча, хоць не ў часе,
Чуткі цецярук.
А над хатай дым бялявы
Выгнуўся дугой,
Не йдзе ў гору, кучаравы,
А на ніз, на дол, на травы
Нікне галавой.
Парна з ранку. Муць разліта,
Нібы сум павіс.
Даль у сінеч апавіта.
«Будзе дожджык»,—шэпча жыта,—
«Дым пайшоў на ніз».
15.IV.1939.

НАВУКОВАЯ СЕСІЯ, ПРЫСВЕЧАНАЯ А. М. ГОРКАМУ

5—7 чэрвеня ў Менскім педагагічным інстытуце была праведзена навуковая сесія, прысвечаная жыццю і творчасці А. М. Горкага.

Адкрываючы сесію, дырэктар Менскага педагагічнага інстытута сказаў, што праводзіцца яна не толькі таму, што ў хуткім часе спаўняецца 3 годы з дня ўмярцвення А. М. Горкага ворагамі народа, не толькі таму, што педагагічны інстытут носіць імя вялікага пісьменніка, а і таму, што творчасць Горкага—вэйстрая зброя совецкага народа ў барацьбе за комунізм.

Першым быў заслухан даклад аспіранта тав. Столпнера на тэму «Фельетоны Іегудзіла Хламіды (Горкага)». Тав. Столпнер зрабіў падрабязны разгляд фельетонаў А. М. Горкага, якія друкаваліся ў 90-х г.г. мінулага стагоддзя ў Саратаўскай газеце.

Прафесар Галавенчанка выступіў з дакладам аб народнасці творчасці Горкага. Таксама былі заслуханы даклады прафесара Неймана—«Мова горкаўскай драматургіі», прафесара Дабрыніна—«Ленін і Горкі», акадэміка Сокалава—«Горкі і народная творчасць», дацэнта Пархоменка — «Горкі і украінская літаратура», дацэнта Шлосберга—«Эвалюцыя рускай інтэлігенцыі па раману «Клім Самгін». Усяго было прачытана 12 дакладаў.

Навуковая сесія выклікала вялікую зацікаўленасць студэнтаў і выкладчыкаў педагагічнага інстытута.

А. Г.

Узнагароджанне ўдзельнікаў дэкады кіргізскага мастацтва

За выдатныя заслугі ў развіцці тэатральнай і музычнай культуры і выхаванне нацыянальных мастацкіх кадраў Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР узнагародзіў ордэнам Леніна Кіргізскі дзяржаўны музычны тэатр і ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга Кіргізскую дзяржаўную Філармонію.

За выдатныя заслугі ў справе развіцця кіргізскага тэатральнага мастацтва Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР узнагародзіў рад удзельнікаў дэкады кіргізскага мастацтва ордэнамі Совецкага Саюза. Ордэнам Леніна ўзнагароджаны заслужаная артыстка Кіргізскай ССР Анвар Куттубаева, заслужаны дзеяч мастацтваў Кіргізскай ССР Абдылас Малдыбаеў. Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ўзнагароджаны 15 чалавек, ордэнам «Знак почета» — 29 человек і медаллю «За трудовое отличие» — 25 чалавек.

Заслужанаму дзеячу мастацтваў Кіргізскай ССР Абдыласу Малдыбаеву прысвоена званне народнага артыста СССР.

----o----

Да 800-гадовага юбілею Нізамі

Акадэмія навук СССР і Саюз совецкіх пісьменікаў дзейсна рыхтуюцца да 800-гадовага юбілея буйнейшага азербайджанскага паэта XII стагоддзя. Нізамі нарадзіўся ў 1141 годзе і памёр у 1203 годзе ў горадзе Генджа, цяпер Кіравабад. Ён з'яўляецца аўтарам пяці вялікіх паэм, стварыўшых эпоху ў літаратуры Ірана, Сярэдняй Азіі, усяго Закаўказзя, Турцыі і г. д.

У гутарцы з нашым карэспандэнтам буйнейшы знаток Нізамі, член-карэспандэнт Акадэміі навук СССР Е. Э. Бертэльс паведаміў:

— Навуковыя супрацоўнікі Інстытута усходазнаўства, Інстытута гісторыі і Эрмітажа працуюць зараз над перакладамі Нізамі з тым, каб зрабіць яго творчасць даступнай рускаму чытачу. Ю. П. Верхоўскі працуе над празаічным перакладам паэмы «Лейлі і Меджнун» — выключнага па сіле апавядання аб маладым чалавеку, звар'яцеўшым ад кахання. Навуковыя супрацоўнікі Эрмітажа Г. М. Пціцын і М. М. Дзьяканаў працуюць над вершаванымі перакладамі Нізамі. Г. М. Пціцын перакладае паэму «Хасроў і Шырын», М. М. Дзьяканаў — паэму «Сем партрэтаў». «Сем партрэтаў» — гэта дзівосная па багаццю фантазія, — сем казак, жартаўлівых, дасціпных і лірычных. Заканчваецца работа над вялікай манаграфіяй аб Нізамі і пераклад паэмы аб Аляксандру Македонскім.

Над вялікім даследваннем аб эпосе Нізамі «Генджа ў XII стагоддзі» працуе прафесар І. П. Петрушэўскі.

Ленінград.

А. Маісееў.

Юр. Віцьбіч

Ты чуеш, Жан?

(Урывак з аповесці)

Увечары выходзіў з Дзвінска беспрацоўны брукар Петэр Лапса. Выпраўлялі старога ў падарожжа да Рыгі толькі сонца і Бобіс. Першым застаўся ззаду Бобіс. Худы сабака, вельмі падобны да льва на дзяржаўным гербе, лізнуў на развітанне шурпатую руку. Потым паступова схавалася шчырае да ўсяго жывога сонца. І, нарэшце, засталіся на шляху ноч ды падарожнік.

Падарожнік, прыкульгваючы, ішоў праз ноч. Часам ён павялічваў крок і адразу-ж, зморшчыўшыся, змяншаў яго. На першы погляд здавалася, што ў дзеда звычайны для яго год і прафесіі рэўматызм, але так толькі здавалася. У сапраўднасці ўсё тлумачылася турмой. Стары Лапса толькі ўчора выйшаў з яе.

Перш чым трапіць у турму, беспрацоўны брукар працаваў у рэкламным бюро. Працаваў, пакуль не здарыўся з ім адзін выпадак. Дзед ішоў тады сярод святочнага натоўпу мясцовых гандляроў і чыноўнікаў. На галаве ў яго быў накладны парык, за плячамі табурэтка, а на грудзях партрэт чалавека, падобнага тварам да Петэра Лапсы, але зусім лысага. На самым людным месцы стары ўзлез на табурэтку і, паказваючы рукой на партрэт, закрычаў:

— Яшчэ ў маладосці я аблысеў. Мяне кінула прыгожая жонка, забраўшы з сабой дарагога сына. І мой сямейны ачаг аднавіла цудоўная паста для вырошчвання валасоў фірмы «Гунд і К°». Дзякуючы ёй я зараз самы шчаслівы на свеце брунет. Купляйце пасту фірмы «Гунд і К°» пастаўшчыка прэзідэнта рэспублікі Нікарагуа. Поспех гарантыраван! Запомніце, запішыце, усім знаёмым раскажыце, — фірма «Гунд і К°»! «Гунд і К°»! Засцерагайцеся падробкі!

Вакол агента вырабаў фірмы «Гунд і К°» хутка збіраліся ўкормленыя разявакі, разглядаючы яго са зняважлівым смехам. І тады дзед больш не вытрымаў. Прымусіўшы сваіх слухачоў аслупянець ад нечаканасці, ён сарваў з сябе парык і, паказваючы на радкія валасы пад ім, закрычаў яшчэ больш моцна, чым раней:

— Калі ў старога Петэра з-пад Люцына яшчэ засталося крыху валасоў, дык толькі таму, што ён ніколі не мазаў іх каланіцай фірмы «Гунд і К°». Калі вам хочацца, каб вашы галовы напаміналі більярдныя шары, купляйце ворвань фірмы «Гунд і К°». Поспех цалкам забяспечан. Запомніце, запішыце, усім знаёмым раскажыце,—фірма «Гунд і К°». Засцерагайцеся падробкі!

Натоўп здаволеным рогатам сустрэў выкрыццё агента. Дзед радасна ўсміхаўся, што зняважыў сваіх сёнешніх плутаватых гаспадароў, але калі ўважліва агледзеўся вакол, дык зразумеў сваю памылку. Ён падняў уверх жылісты кастлявы кулак, што прымусіла натоўп зацікаўлена сціхнуць, і зноў закрычаў:

— Можа, вам здаецца, пузатая поскудзь, што я — вандроўны клоун? А можа, вам здаецца, што гэта я, шкадуючы вас, утаптаў у гразь фірму «Гунд і К°»? Вы-ж такія самыя жулікі. Старога Петэра з-пад Люцына прымусіла клеіць дурня перад вамі, крывасмокамі і паразітамі, нястача і беспрацоўе. Калі-б мне ўчора загадалі крычаць: «Я быў цяжарным і абартыраваў», — я крычаў-бы. Я крычаў бы, бо мне трэба крыху сантымаў на ўласную патрэбу і на дапамогу сыну, які сёння катаржнік. А катаржнік ён выключна таму, што вы, забойцы і зладзеі, не на катарзе. Я брукар, я ўсё жыццё брукаваў вуліцы, але-ж я навучу беднякоў, як лепш разбрукоўваць гэтыя вуліцы, каб абваліць іхны булыжнік на вашы подлыя галовы!

Толькі-што здаволены натоўп рынуўся цяпер да прамоўцы з кійкамі. Палісмены выратавалі дзела ад самасуду, каб потым самім моцна збіць яго ў турме. Таму і прыкульгваў цяпер Петэр Лапса. І ўсё-ж гэты фізічны боль быў непараўнальна меншы за іншы боль, які прымушаў часам старога шаптаць нейкае імя.

. . . .

Ідуць уздоўж берага грознага мора высокія дзюны. Іх салоны пясок, які часам звініць, нібы тонкае шкло, пакрываюць дзе-ні-дзе расліны: заўсёды зялёныя верасы, паўзучыя вадзянікі, блакітныя арэнарыусы і махнатыя анемоны. Паміж дзюнамі туляцца невялікія рыбацкія вёскі, абкружаныя вялізнымі сецямі, як плотам. А ў тых невялікіх вёсках жыве маленькі народ — лівы.

— Раней нас было столькі, колькі селядцоў, а цяпер столькі, колькі кітоў, — гавораць пра сябе негаваркія лівы.

Калісьці адабралі ў іх зямлю і пакінулі мора. І гэта мора, суровае мора, ніхто так не любіць і ніхто так не ведае, як суровыя лівы. Іх старыя баркасы з латанымі парусамі можна сустрэць у розных кутах Балтыкі. Усё багацце ліваў — сеці і баркасы. Калі добра ідуць да берага селядзец і кілька, асяцёр і стаўрыда, камбала і ласось, тады поўныя сеці і баркасы, тады рыбакі спяваюць зухаватыя песні.

Але ў вёсцы Кранмальн пад Віндавай у той год не спявалі песень. Нечаканы шквал парваў і клочкам выкінуў на бераг уласнасць усёй вёскі — трохкіламетравую сець. Таму паўз Кранмальн прайшлі і селядзец, і кілька, і асяцёр, і стаўрыда, і камбала, і ласось. Усю зіму кранмальнчане, старыя і малыя, вязалі новую сець, потым дубілі яе і смалявалі. Нельга пераказаць тую радасць, з якой яны выехалі на правесні ў мора, насустрач першым касякам рыбы. І нельга таксама пераказаць рыбацкае гора, калі ў першую-ж ноч знікла невядома куды новая сець. Прыйшлося рыбацкай вёсны пайсці з просьбай да гаспадара бліжэйшай фабрыкі, пана Эргля. Пан не адмовіўся даць на лета ў арэнду сець, але рыбакі павінны былі за гэта з кожных трох рыбін адну аддаць яму. Не палезлі ў кабалу лівы. З пустымі рукамі вярнуліся дамоў.

І не вытрымала рыбацкае сэрца.

У пачатку красавіка падняў на ногі ўвесь Кранмальн сляпы і зялёнавалосы ад старасці рыбак. Ён хутка ішоў ад берага, дзе заўсёды сядзеў на камені, і крычаў:

— Ідзе селядзец! Хіба вы не чуеце, лівы, што ідзе селядзец?

Рынуліся да мора беднякі, і сапраўды пачулі і пабачылі, што ідзе селядзец. Нават клакатала мора. Нават водбліск ішоў па небу. Нават памутнела ад выметанай ікры вада. І з аглушальным крыкам суправаджалі рыбу драпежнікі — зграбныя чайкі, хуткія альбатросы і белахвостыя арланы. Ніколі не праходзіў каля Кранмальна такі вялікі касяк.

І не вытрымала рыбацкае сэрца.

Зноў пайшлі лівы паміж дзюнамі да фактары. Блыталіся пад іх нагамі верасы і вадзянікі, арэнарыусы і анемоны. Калі прыйшлі, найбольш сівы рыбак, вынуўшы з роту неадлучную гліняную люльку, звярнуўся да прамыслоўца:

— Парваў шквал... Тапелец у невад пана бога! Дзве рыбы лівам, адну — Эрглe... Святому Юр'ю міну ў зубы, дзюну ў глотку!

Рыбакі пахадзілі ўжо з новай сеццю да Кранмальна, калі іх здагнаў работнік з фактары, Жан.

— Слухайце, лівы,—сказаў юнак, — вашу сець парэзаў на часткі не шквал, а маторны бот фактары. Эргле хацеў гэтым вас закабаліць.

І кранмальнчане на чале з Жанам павярнулі назад. Іх адваротны рух нагадваў марскі прыбой. Іх кулакі нагадвалі матроскія вузлы. У складах фактары яны знайшлі кавалкі сваёй сеці.

І не вытрымала рыбацкае сэрца.

Суцэльнае вогнішча ўяўляла з сябе праз невялікі час фактарыя. Каля варот яе валяўся ўтаптаны ў гразь рыбацкімі ботамі труп, у якім цяжка было нават пазнаць пана Эргле.

А на другі дзень пасля гэтага прыйшоў атрад палісменаў. Калі яны адышлі, напалову абязлюдзеў Кранмальн. Трапілі яго жыхары разам з работнікам Жанам на катаргу — ламаць дзікі камень.

. . . .

Аб гэтым думаў, ідучы праз ноч, Петэр Лапса. А ноч усё больш і больш ахутвала сваімі шырокімі крыллямі зямлю. І з кожнай мінутай усё вышэй і вышэй падымаліся ад гарызонту к зеніту халодныя агні. І з кожнай мінутай усё мацней і мацней набухаў на вялізным ілбе сусвету Млечны шлях.

Падарожнік ішоў усё ўгару. Здавалася, што там, уперадзе, Рыжскі шлях сустракаецца з Млечным. Нечакана калі да Млечнага шляху засталося толькі некалькі крокаў, Рыжскі шлях пачаў спускацца ўніз. Перад адзінокім падарожнікам разлеглася вялікая, зацягнутая туманамі лагчына.

— Жан! Ты чуеш мяне, Жан?!—разнеслося раптам над лагчынай і пакацілася над ёй водгукамі.

Чалавек з раздарожжа Млечнага і Рыжскага шляхоў крычаў з такой сілай, што не можа быць, каб яго не пачулі ў тую самую ноч і Латгалія, і Земігалія, і Рыга, і Дзвінск, і вёска Кранмальн, і Капальня, дзе ламае кіркай камень бязвусы, яснавокі юнак.

— Гэта крычыць твой бацька! Стары Петэр з-пад Люцына! Я іду разбрукоўваць вуліцы! Ты чуеш, Жан?



Спектаклі дэкады кіргізскага мастацтва ў Маскве. Сцэна з 3 карціны музычнай драмы «Аджал Орлуна». Фотахроніка ТАСС.

САПСАВАНЫ ПЕРАКЛАД

Усім вядома, што пераклад мастацкіх твораў — справа творчая, што гэту работу павінны рабіць людзі, якія добра ведаюць мову арыгінала і мову, на якую перакладаецца твор. Аднак, гэта простая ісціна яшчэ не дайшла да выдавецкіх работнікаў, якія кіруюць справай мастацкага перакладу.

Нядаўна ў Юндзетсектары Дзяржаўнага выдавецтва БССР выйшаў зборнік баек Л. Н. Талстога. У зборніку 11 кароценькіх баек, напісаных вялікім класікам рускай літаратуры для вядомых яго «Рускіх кніг для чытання».

Пераклад гэтых баек на беларускую мову зроблен нядбайна і нават бязграматна. Вось некаторыя прыклады з гэтага «перакладу»:

«Качка плавала па рацэ, адшукваючы рыбу, і ў цэлы дзень не знайшла ніводнай». У арыгінале — «отыскивала», а не «отыскивая». Форма «ў цэлы дзень», механічна перанесеная з арыгіналу, гучыць як грубая памылка. «Ты думаеш, у цябе сілы больш за майго» (маецца на ўвазе «больше моего»). Адкуль узят такі жаргон: «больш за майго»? «Я мацней за цябе». Да ведама перакладчыка і выдаўцоў: леў не дуб, ён дужы, а не моцны. «Дрянной паук» — перакладзена «дрэнны павук». «Пачалі плакацца на сваё жыццё» (у сэнсе: наракаць, скардзіцца). «Пачаў радавацца на свае рогі» (чаму не «з сваіх рагоў»?). «Хвост не да месца» (у арыгінале—«некстати»).

Сустракаецца шмат слоў, недарэчна перакладзеных. «Унесло» перакладзена «знесла», «заробела»—«забаялася», «смеяться»—«кпіць», «как пришлось»—«як давялося» (у сэнсе прыйшлося, а не трапілася), «клевать» — «кляваць» і т. д.

Сустракаюцца і грубыя скажэнні талстоўскага тэксту. У арыгінале напісана: «Он уходил, а как пришел в лес, запутался рогами...» Перакладзена: «Ён амаль выратаваўся, а як прыйшоў у лес, заблытаўся рагамі...» Справа ідзе пра аленя, на якога напаў леў. І чаго варта гэта недарэчная адсябяціна: «ён амаль выратаваўся»?

Аўтар сапсаванага перакладу нам невядом, а ўсе іншыя ўдзельнікі гэтай справы вядомы. Гэта — рэдактар перакладу Парамонаў, літпраўшчык Сапрыка і карэктар Баўдзей.

ЧЫТАЧ.

СКАЗАЛЬНІКІ БССР

Усесаюзны Дом народнай творчасці праводзіць у Маскве з 20 па 30 чэрвеня 10-дзённы семінар сказальнікаў. Задача семінара — узняць агульна-культурны ўзровень сказальнікаў, уцягнуць іх у творчае спаборніцтва па прапагандзе пастаноў XVIII з'езда ВКП(б).

Дом народнай творчасці БССР пасылае на гэты семінар трох лепшых сказальнікаў рэспублікі. У сучасны момант адборачная камісія ў складзе прадстаўнікоў Дома народнай творчасці і Акадэміі навук БССР знаёміцца з творчасцю сказальнікаў для адбору кандыдатаў на семінар. Камісія ўжо азнаёмілася з 6 сказальнікамі. Чакаецца прыезд яшчэ 10 чалавек.

ВЫДАТНАЯ БІБЛІЯТЭКА

У калгасе «12-годдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі», Затонскага сельсовета, Жлобінскага раёна, абсталявана выдатная бібліятэка, у якой налічваецца каля 1.000 кніг мастацкай літаратуры. У бібліятэцы ўзорны парадак. Калгаснікі вельмі актыўна наведваюць яе. Чытаюць кнігі не толькі моладзь, але і пажылыя калгаснікі і калгасніцы. Так, 50-гадовы калгаснік Апанас Паўленка прачытаў «Хлеб» А. Талстога, «Адверженыя» В. Гюго і інш. Калгаснік Макар Шамрэнка прачытаў ужо 6 мастацкіх твораў.

Калгасная бібліятэка адыгрывае вялікую ролю ў палітычным выхаванні калгаснікаў.

В. ПАГОДЗІН, Г. КОЖЫЧ.

ВЕРШЫ ІВАНА ШАПАВАЛАВА

Ніхто з лепшых, даўно прызнаных майстроў слова не застрахаван ад асобных творчых няўдач. Цяжка патрабаваць, каб усё, што пішуць пісьменнікі і паэты, было на адным узроўні з лепшым у іх творчасці. Шукаючы новыя мастацкія сродкі для выражэння вялікіх і адказных тэм, пісьменнік часамі памыляецца, зварачвае з прамой дарогі, адмаўляецца ад уласнай мастацкай манеры, ад свайго творчага метаду. Для сапраўднага мастака гэта не страшна — упартыя пошукі і безупынная праца над словам і вобразам рана ці позна прывядуць яго на правільны шлях.

Значна горш, калі пісьменнік самазадаволена любуецца самім сабой і не хоча ці не ўмее ісці наперад, не ўдасканальвае свайго майстэрства, топчацца на адным месцы. Нажаль, такія сучасныя «самазакаханыя Нарцысы» ў пісьменніцкім асяроддзі яшчэ сустракаюцца.

У гэтым артыкуле мы хочам паказаць на прыкладзе Івана Шапавалава, да чаго прыводзіць асобных паэтаў самазадаволенае любаванне сваімі далёка не бліскучымі творамі.

І. Шапавалаў не першы ўжо год піша і друкуе вершы. У 1937 годзе ён выдаў зборнік вершаў «Время близится». Час-ад-часу вершы І. Шапавалава паяўляюцца ў перыядычным друку. Характэрна, што апошнія паэтычныя творы І. Шапавалава («Привет, Москва» і іншыя) сведчаць не аб творчым росце паэта, а хутчэй за ўсё аб слабасці і пароднасці яго творчай манеры.

Усе без выключэння вершы І. Шапавалава даводзяць, што паэт мысліць не мастацкімі вобразамі, а гатовымі лозунгамі і формуламі.

Узяўшы надзвычай хвалюючую тэму аб заваяванні міжпланетных прастораў, І. Шапавалаў не знайшоў у сваім паэтычным арсенале ніводнай уласнай думкі, ніводнага прасякнутага шчырым пачуццём слова. І фантазія аб будучых палётах на Марс прыняла пад пяром паэта выгляд самай сухой і халоднай інфармацыі:

Я знаю,
уверен я,
что доживу
До дня,
когда Громов и Спирин
Свершат
не в романе, а на яву
Прогулку на Марс
иль хотя б на Луну,
В пустыни
межзвездного мира.
И с очень спокойным
выраженьем лип
Они деловито и кратко,
Преодолев тяготенье земли,
Радируют:
«Все в порядке».

Мы не сустралі ў зборніку «Время близится» ні адной сур'ёзнай спробы І. Шапавалава раскрыць, напоўніць паэтычным зместам тыя формулы і мыслі, на якіх пабудаваны яго вершы. У адным з сваіх вершаў І. Шапавалаў хоча выразіць думку, што смеласць нашых лётчыкаў спалучаецца з магутнай тэхнікай сацыялізма. Не раскрыўшы гэтай формулы, не знайшоўшы ніякіх сродкаў для яе апасродкавання, І. Шапавалаў вырашае толькі адну задачу — як-небудзь зрыфмаваць усе радкі, а там будзь што будзе. І нядзіва, што прыходзіцца чытаць такую бяссэнсіцу:

Выше
перстых облаков
Водим мы
боевые машины,
Множа
страстность большевиков
На моторов клекот орлиный.

Але справа не абмяжоўваецца толькі тым, што І. Шапавалаў множыць страсць людзей на... клёкат матораў альбо прымушае мартэны «истекать сталью». Паэт наогул не задумваецца над зместам сваіх твораў. Там, дзе тую ці іншую думку нельга ўціснуць ў вершаваныя радкі, не парушыўшы іх рытмічнай цэльнасці, ён карыстаецца самымі выпадковымі словамі, афяруючы зместам верша ва ўгоду форме. Нават выразіць простую думку, што ворагам не ўдасца адняць у савецкага народа яго перамогі і заваёвы, І. Шапавалаў не здолеў, і ён напісаў:

Под солнцем пылающим
сил таких нет,
что смогут отнять
неизбежность побед
У нас...

Калі верыць І. Шапавалаву, ворагі замахваюцца не на нашы, ужо заваяваныя, перамогі, а толькі на непазбежнасць гэтых перамог.

Бесклапотныя адносіны к слову прыводзяць І. Шапавалава да двухсэнсовых і палітычна няправільных фармуліровак. Як ні дзіўна, а даводзіцца растлумачваць І. Шапавалаву, што мы абараняем сваю краіну не «с бандитскою шайкой в бою», а ў баю супроць бандыцкіх шаек. Розніца, як бачыце, вялікая.

І. Шапавалаў не ўмее заглянуць у нутро апісваемых ім людзей, паказаць іх пачуцці і інтымныя перажыванні. Унутраным светам сваіх герояў паэт цікавіцца вельмі мала. Ён абмяжоўваецца толькі перадачай іх знадворных рухаў, іх знешняга рэагіравання на самыя хвалюючыя падзеі. Напрыклад, пагранічнік марознай зімняй ноччу скінуў валёнкі і кажух, каб здагнаць парушальніка савецкай граніцы. Пагранічнік затрымаў лютага ворага, але пры гэтым паплаціўся сваімі нагамі. Бязногаму герою прынеслі ў шпіталь ордэн Чырвонага Сцяга. Вось як апісвае гэта Шапавалаў:

Когда в госпиталь
ему, безногому,
Принесли орден
Знамени Красного,
Вымолвил:
— Это что-то много...
За что?..
Правда же, напрасно.
Взяв розетку
в исхудалые пальцы,
Обращаясь к себе,
произнес догадываясь:
— Ведь как же иначе?
Он бы...
Смотался.

Сапраўды, трэба быць надзвычай халодным чалавекам, каб не ўбачыць усёй велічы аптымістычнай трагедыі маладога байца-пагранічніка, усёй глыбіні перажыванняў адважнага патрыёта радзімы. Трэба, нарэшце, згубіць пачуццё і страсць паэта, каб прымушаць бязногага героя савецкай граніцы, загубіўшага сваё здароўе ў самаахвярнай барацьбе з ворагамі, здзіўляцца, што партыя і ўрад узнагародзілі яго за выключную адвагу.

Нас па меншай меры здзіўляе, што ў адным з сваіх артыкулаў крытык М. Клімковіч пісаў, што «у паэтычнай творчасці Шапавалава адчуваецца сапраўдная вучоба ў лепшага паэта нашай эпохі — В. В. Маякоўскага, вучоба не толькі форме (што было ў многіх ранніх вершах Шапавалава), але і яго майстэрству». Папершае, незразумела, навошта спатрэбілася М. Клімковічу спецыяльна для І. Шапавалава шукаць якуюсьці розніцу паміж формай і майстэрствам. А, па-другое, мы не знаходзім ніякіх падстаў для сцвярджэння, што І. Шапавалаў паспяхова вучыцца ў Маякоўскага. З вершаў І. Шапавалава гэтага пакуль-што не відаць.

Я. ГЕРЦОВІЧ.

Я. Шарахоўскі

АБ КРЫТЫЦЫ

(Некаторыя заўвагі)

Пытанне аб крытыцы зараз стаіць так востра таму, што крытыка не здавальняе патрабаванняў нашай, надзвычай выраслай за апошнія годы літаратуры і яшчэ больш — чытача. Адной з галоўнейшых заган нашай крытыкі да апошняга часу было тое, што яна толькі займалася разглядам асобных твораў, у ёй не было абагульняючай мыслі. За 1938 год і першую палову 1939 года нельга назваць ніводнага артыкула, які даваў-бы абагульняючы разгляд творчасці таго ці іншага пісьменніка. Гэта адставанне крытыкі нічым не апраўдана. У нас ёсць тэарэтычна падрыхтаваныя людзі, якія могуць пісаць поўнацэнныя крытычныя работы, ставіць важныя літаратурныя праблемы. Патрэбна толькі належным чынам арганізаваць наяўныя крытычныя кадры і стварыць ім належныя ўмовы для работы.

Для таго, каб стымуліраваць крытычную работу, трэба назаўсёды пакончыць з недаацэнкай крытыкі, з тым, калі крытыцы адводзілася другараднае месца, калі крытык лічыўся другарадным літаратарам. Трэба сказаць, што ў недалёкім мінулым у практыцы Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР былі тэндэнцыі супроцьстаўлення пісьменнікаў крытыкам. Гэтыя тэндэнцыі ўсялякім чынам падтрымліваліся і пашыраліся варожымі нацыяналістычнымі і трацкісцкімі элементамі, якія імкнуліся абяззброіць і дэмаралізаваць крытыку.

Цяпер трэба стварыць такія ўмовы, каб крытык адчуваў, што ён займаецца важнай літаратурнай работай.

Не заўсёды ў нас крытыкі помняць аб тым, што яны працуюць не толькі для пісьменнікаў, але і для чытачоў. Гэта забываецца прыводзіць да няправільнай арыентацыі ў рабоце, да таго, што ў ацэнку твора ўносіцца рад пабочных меркаванняў. Асабліва часта гэта мае месца тады, калі даводзіцца ацэньваць твор заслужанага пісьменніка. У такіх выпадках або дыпламатычна замоўчваюцца заганы, або цэнтр цяжару пераносіцца на дробязі, на другараднае. Замест таго, каб адкрыта сказаць, што пісьменніку ў творы ўдалося і што не ўдалося, якую каштоўнасць мае твор у цэлым, крытык абмяжоўваецца заўвагай аб тым, што ў творы ёсць «рад яркіх мясцін».

Прывяду прыклад. А. Кучар у артыкуле аб «Кацярыне» П. Броўкі пісаў, што ў паэме мала раскрываецца ўнутраны свет Кацярыны, што з інтэлектуальнага боку яна застаецца ў цені, што няма глыбокага раскрыцця яе думак аб будучым, аб радзіме, аб сваім жыцці, аб будучыні, што аўтар наогул больш расказвае аб ёй, а не паказвае яе. Калі-б гэта была паэма не П. Броўкі, а іншага паэта, з гэтага былі-б зроблены досыць рашучыя вывады. Але паколькі паэма належыць пяру П. Броўкі, то заганы паэмы абумоўлены «парокамі, што пануюць яшчэ ва ўсёй нашай літаратуры». Так сказаць, аб'ектыўнае становішча вінавата, не дарасла яшчэ наша літаратура да сапраўдных мастацкіх твораў. Па-першае, гэта проста няпраўда. У нас ёсць шмат высокамастацкіх твораў, сярод якіх ёсць не адзін твор і П. Броўкі. Па-другое, у сваёй крытыцы паэмы А. Кучар не ўсё дагаварвае. Што, напрыклад, хоча сказаць А. Кучар такім вывадам: «І ўсё-ж, не гледзячы на іх (заганы — Я. Ш.), П. Броўка стварыў рад глыбока хвалюючых карцін, сапраўды паэтычных і мастацкіх, раскрываючых у вобразе Кацярыны трагічнае мінулае і радаснае светлае сучаснае беларускай жанчыны». Як-жа, нарэшце, трэба ацэньваць паэму П. Броўкі? Што ўяўляе сабою твор у цэлым?

Калі тав. Кучар сцвярджае, што зусім не паказан унутраны свет Кацярыны, дык гэта азначае, што ў паэме няма псіхалагічнага рысунка. Калі ёсць расказ і няма паказу, дык гэта азначае, што ў паэме няма патрэбнага пачуцця. Як-жа ўсё гэта звязаць у адно? Ды і наогул нікуды не варта, калі крытык не гаворыць з пісьменнікам як роўны з роўным, а бяжыць за ім подбежкам і, хапаючыся за крысо, глядзіць яму ў вочы, ці не пакрыўдзіўся пісьменнік?

У ацэнцы літаратурных твораў нельга забываць аб эстэтычным крытэрыі. Усе пабочныя меркаванні павінны быць адкінуты. Такі падыход да справы прымусіць крытыкаў перагледзець свой крытычны інструментарый. Для ўсіх ясна, што з выказваннем эстэтычных ацэнак у нашай крытыцы не ўсё ў парадку. Крытыкі ахвотна робяць характарыстыку зместу, агульна заўважаюць: «пісьменнік паказвае», «верш цікавы» і г. д.

Асабліва дрэнна абстаіць справа ў гэтым сэнсе з крытыкай паэзіі. З прозай лягчэй, там можна прааналізіраваць вобразы, разабраць кампазіцыю і — артыкул гатоў. Для аналіза-ж паэзіі патрэбны іншыя метады.

Паэтыка соцыялістычнага рэалізма астаецца нераспрацаванай. За гэту работу трэба ўзяцца, бо матэрыял ёсць.

Крытыкам часам прыходзіцца звяртацца за дапамогай да гімназічных курсаў славеснасці. Прыклад — артыкул тав. Ларчанкі «Паэтычныя асаблівасці лірыкі Якуба Коласа» («Полымя Рэвалюцыі» № 1, 1938 год). У гэтым артыкуле самы прасталінейны і грубы соцыялагізм спалучаецца з гімназічнымі разважаннямі аб харэях і ямбах. Разглядаючы коласаўскую элегію, тав. Ларчанка піша: «Усе гэтыя вершы з элегічнымі матывамі выражаюць ідэйную разгубленасць, рамантычную і нацыяналістычную настраёвасць паэта, што часамі (асабліва ў часе рэакцыі 1908—1910 гг.) праяўлялася ў яго творчасці».

У гэтыя-ж годы Я. Колас пісаў і сатыры. Аб іх тав. Ларчанка піша наступнае: «Сатыры, прысвечаныя высмейванню царскага суда, паліцыі, выкрыццю царскай «канстытуцыі», цара, самаўладства («Канстытуцыя» — 1908 г. «Мікалаю II» —1908 г. «Старому парадку»— 1909 г.), выконваюць рэвалюцыйна-дэмакратычную ролю. Гэтыя сатыры адрозніваюцца ад элегій дынамічна-мажорнымі матывамі, а іхняя лексіка — рэалістычнай меткасцю і вайстрынёй».

Метадалогія тут вельмі простая. Калі ў паэта сумны настрой, ён піша элегіі— ён і ідэйна разгублен, і рамантык, і нацыяналіст, а калі ён піша сатыры, высмейваючы цара і яго прыслых — ён і рэвалюцыянер-дэмакрат і рэаліст. Тав. Ларчанку ніколькі не турбуе тое, што гэтыя элегіі і сатыры тав. Коласам пісаліся ў адзін час. Такім чынам крытык для аднаго і таго-ж часу дае дзве процілеглыя ацэнкі.

Разглядаючы мастацкія асаблівасці лірыкі Коласа, т. Ларчанка шмат разважае пра паэтычна-сінтаксічныя фігуры, пра клічную і пытальную інтанацыю, пра страфічную анафару і эпіфару — усё гэта толькі для таго, каб зрабіць вывад, што «коласаўскія рытміка-сінтаксічныя фігуры ў розны час і ў розных вершах нясуць неаднолькавую ідэйную функцыю». Сапраўды, гара нарадзіла мыш! Ці варта было для такога нікчэмнага вываду гарод гарадзіць. Ды і наогул разважаць на матэрыяле пытальных і клічных інтанацый аб ідэйных функцыях — гэта геркулесавы слупы соцыялагізма.

Тав. Ларчанка, відаць, адчуў пароднасць такой метадалогіі, бо ў наступных артыкулах ён ад яе адыходзіць. Але нельга сказаць, што ён цалкам вызваліўся ад павярхоўнага падыходу да разгляду паэзіі. Нельга, напрыклад, згадзіцца з тым, што паэма А. Куляшова «У зялёнай дуброве», як сцвярджае Ларчанка, напісана ў форме «лірычнай песеннасці» (наогул, што гэта за форма: «лірычная песеннасць»?). Песенныя элементы ў паэме выражаны не настолькі моцна, каб яе лічыць лірычнай паэмай-песняй. Але справа не ў гэтым. Справа ў тым, што тав. Ларчанка супярэчыць сам сабе. У адным месцы артыкула ён гаворыць, што ў паэме няма сюжэтнай раскіданасці, у другім-жа сцвярджае, што ў паэме дзве сюжэтныя лініі, звязаныя механічна і штучна. Чаму верыць? У адным месцы тав. Ларчанка сцвярджае што рытміка паэмы «з'яўляючыся ўвогуле добраю, гібкаю і песенна-лёгкаю, мілагучнаю, у паасобных мейсцах, аднак не адпавядае ідэйнаму і тэматычнаму характару асобных падзей паэмы. Рытміка гэтага твора ад пачатку да канца прасякнута мінорнай песеннасцю» (вядома, цяжка сабе ўявіць, як гэта рытміка прасякнута... песеннасцю). У другім месцы сцвярджаецца: «усякім размерам можна паказаць рознастайныя нюансы перажыванняў», адны і тыя-ж размеры могуць быць, у залежнасці ад ідэйнага пафаса паэта, мінорнымі і мажорнымі. Такім чынам, з аднаго боку, рытміка не падыходзіць, а, з другога боку, ўсякая рытміка можа падыйсці, бо ўсякім размерам можна выразіць нюансы перажыванняў. Тав. Ларчанка не заўважае супярэчнасці ў сваіх разважаннях і робіць вывад: «Значыць справа не ў рытмічным размеры, а ва ўменні паэта аднолькавы размер зрабіць рознастайна-рытмічным». Словам, пішы, тав. Куляшоў, хоць харэем, але ўмей яго зрабіць у той-жа час і не харэем. Увогуле атрымліваецца нешта накшталт афарызма Козьмы Пруткова

Найбольш смела і цікава разглядае паэзію тав. Бярозкін. Ён паабягае агульных мясцін, штампаў, імкнецца знайсці характэрныя асаблівасці кожнага паэта. Напрыклад, у артыкуле «Аркадзь Куляшоў» тав. Бярозкін дастаткова пераканаўча паказвае асаблівасці мастацкага развіцця тав. Куляшова. Можна назваць і іншыя, не менш удалыя, артыкулы. Аднак, у артыкулах тав. Бярозкіна адчуваецца імкненне замкнуцца ў сваёй спецыяльна паэтычных праблем, баязнь ісці ад назіранняў над мастацкімі асаблівасцямі да ідэйна-палітычных абагульненняў.

Наша крытыка павінна быць сінтэтычнай. У крытыка павінна быць стройная сістэма эстэтычных поглядаў, як частка яго марксісцка-ленінскага светапогляду. Вось гэта сувязь эстэтычных ацэнак з агульным светапоглядам не заўсёды дастаткова выразна адчуваецца ў тав. Бярозкіна.

Гаворачы аб падыходзе крытыкаў да ацэнкі асобных твораў, варта ўспомніць пра дыскусію, якая ў мінулым годзе ўзнікла паміж тав. Глебкам і тав. Клімковічам у сувязі з паэмай Э. Агняцвет «Фелікс Дзяржынскі». Гэта дыскусія паказвае, што мы яшчэ не навучыліся падыходзіць да ацэнкі твораў з пункту гледжання эстэтычнага крытэрыя. Калі тав. Глебка зусім справядліва ўказаў на заганы паэмы, дык тав. Клімковіч выступіў з артыкулам, у якім імкнуўся апраўдаць недапрацаванасць паэмы. Пры чым, як аказалася, важкіх довадаў у яго не было, бо ён па сутнасці згадзіўся з палажэннямі, высунутымі тав. Глебкам. Тав. Клімковіч пісаў: «У паэме ёсць рад зусім слабых мясцін, якія патрэбна перапісаць нанава, рад мясцін, якія патрабуюць развіцця думкі, пашырэння паказу вобраза Дзяржынскага. У самой біяграфіі Дзяржынскага ёсць эпізоды, якія вельмі нагляднa можна было-б бачыць у паэме». Гэта — якраз тое, пра што казаў у сваім артыкуле і тав. Глебка. У чым-жа разыходжанне? Разыходжанне ў тым, што на думку тав. Клімковіча аўтару можна дараваць многае, бо ён узяў арыгінальную і цікавую тэму. Гэта — устаноўка няправільная. Яна вядзе да заніжаных патрабаванняў да мастацкай якасці твораў.

Нажаль, погляды, выказаныя тав. Клімковічам, яшчэ і цяпер бытуюць у нашай літаратурнай грамадскасці, у нашых рэдакцыях. І гэта пытанне мае вялікае прынцыповае значэнне. Нельга хваліць аўтараў за пасрэдныя, а часам і няўдалыя творы, трэба прымусіць іх па-сапраўднаму вучыцца, па-сапраўднаму авалодваць літаратурным майстэрствам. І ў маладым пакаленні крытыкаў трэба выхоўваць добры мастацкі густ.

КАЗАЦКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ

Казацкую самадзейнасць жывяць народныя сокі. Жыхары станіц плодароднай Кубані, ціхага Дона, быстрага Тэрэка — казакі — чэрпаюць багацейшы рэпертуар свайго самадзейнага мастацтва з народных паданняў, легенд, песень, частушак. Любяць яны і творчасць совецкіх кампазітараў, класіку. Калі пабыць на адным з іх вечароў, у памяці застанецца вялікае ўражанне ад разнастайнай праграмы, майстэрства, ад ідэйнай насычанасці ўсяго паказу.

Пасля коннага прабегу, які заняў амаль увесь вучэбны дзень, у новапабудаваным клубе, упрыгожваючым ваенны гарадок, быў прызначан вечар казацкай творчасці. Зала хутка запаўняецца. Прышлі казакі—байцы і камандзіры, жонкі каманднага складу. І яшчэ не было пачатку, а ў зале стаяў звон ад песень, ад плясак, ад ігры гармоні.

Паднялі заслону.

На сцэне выстраіўся казацкі хор. Малодшы камандзір тав. Каламеец вышаў з-за куліс, агледзеў быстрым позіркам спевакоў — і грымнула песня.

Казацкі хор, а ў яго складзе лічацца такія таленавітыя выканаўцы, як камандзір звяна Цеткічаў, малодшы камандзір Маскаленка, малодшы камандзір узвода Чавела, баец Маскаленка і многія іншыя — вылучаецца дружнасцю, добрым падборам галасоў, вялікай музыкальнасцю.

Аб чым спяваюць байцы? Любімая песня іх — «Казацкая дума», у якой яны расказваюць аб сваім багатым жыцці, аб абноўленых станіцах, аб баявой магутнасці і запрашаюць роднага бацьку, друга і настаўніка таварыша Сталіна прыехаць паглядзець, як лёгка і радасна дыхаецца совецкаму казаку.

Моцна ўвайшла ў рэпертуар казацкіх хораў песня аб хасанаўскай ночы, аб подвігах слаўных казакаў. Шмат у рэпертуары народных песень, народжаных ля Дона, Тэрэка і Кубані.

Цудоўна гучыць народная песня «Пяцігорская вясна». Шмат у песнях лірыкі, пяшчотнасці, любві да радзімы.

Харысты зацягнулі некальк і вясёлых частушак, а на сярэдзіну круга вылецелі плясуны. У праграме — каўказскія танцы, рускія народныя пляскі. Выконваюцца і класічныя рэчы.

Хор пакінуў сцэну. Яго змяніў струнны аркестр, якім кіруюць казакі тт. Афанасьеў і Бабенка. Аркестр добра сыграны, рэпертуар яго разнастайны. Аркестр выконвае творы класікаў, совецкіх кампазітараў. Любяць казакі ў выкананні свайго аркестра жывыя сцэнкі («Млын у лесе», «Поезд» і інш.).



У лагеры Н-скай часці БАВА. Час адпачынку. Чырвонаармейцы А. Грыгор'еў, Н. Телегін, П. Рудаў, І. Кабіськой.

Ёсць сярод удзельнікаў казацкай самадзейнасці майстры свісту, гімнасты-акрабаты, салісты-спевакі, музыканты, расказчыкі.

Горача любяць казакі мастацкае слова. Многа чытаюць. Хто з іх не прачытаў эпапеі казацкага жыцця — «Ціхага Дона» Міх. Шолахава? Многія з іх сустракаліся з пісьменнікам у Растове, Вешэнскай. Зараз яны мяркуюць паслаць Міх. Шолахаву калектыўнае пісьмо. Сярод казакаў ёсць адароныя паэты. Казак Аляксей Жараў надрукаваў у сваёй газеце вельмі цікавую лірычную песню «Падружанькі».

Чырвоныя казакі любяць самадзейную творчасць, яна садзейнічае іх баявой падрыхтоўцы. Народная казацкая самадзейнасць поўнаводная, як Кубань, і красачная, як само наша жыццё.

ЕФ. САДОЎСКІ.

Новая работа А. Бембеля

Заслужаны дзеяч мастацтваў А. А. Бембель і ўваходзячыя ў яго брыгаду скульптары В. Рыттэр і Г. Ізмайлаў закончылі працу над вялікім трохчастковым рэльефам для аванзалы беларускага павільёна Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Асабліва цікава вырашана цэнтральная кампазіцыя гэтага рэльефа, выкананая А. Бембелем. Кампазіцыя паказвае велічную групу: лётчыка з флажком у правай руцэ, пагранічніка, танкіста, парашутыстку і рабочага з пропівагазам. Справа і злева кампазіцыю замыкаюць танкі, артылерыя і самалёты. Уся цэнтральная частка рэльефа адкрывае перад гледачом несакрушальнае адзінства народаў нашай краіны і яе Чырвонай Арміі, якая жалезнай сцяной стаіць на варце свяшчэннай совецкай зямлі.

Другая частка рэльефа, выкананая В. Рыттэрам, паказвае фізкультурную і баявую падрыхтоўку совецкай моладзі. Тут мы бачым коп'еметальніка, баскетбалістку, гранатамётчыка, стралка і дыскаметальніка. Трэцяя частка рэльефа выканана Г. Ізмайлавым на тэму калгаснай працы і абароны.

Ва ўсіх трох частках рэльефа сказалася кампазіцыйнае майстэрства А. Бембеля, які распрацаваў эскізы рэльефа.

А. ДАЛІН.

УВЕКАВЕЧАННЕ ПАМЯЦІ Ю. М. ПЭНА

У чэрвені ў Віцебску адкрываецца мастацкая галерэя Юрыя Майсеевіча Пэна. Народ зноў пабачыць лепшыя карціны аднаго з сваіх выдатнейшых мастакоў. І неяк не верыцца, што калі вы—каваль альбо трактарыст, піонер альбо прафесар — прыдзеце ў галерэю, вас не сустрэне гасцінна на яе парозе нізенькі дзядок у старамоднай талстоўцы без пояса, як калісьці, радасна ўсміхаючыся не пазнаёміць вас з усімі сваімі творамі і не запросіць ветліва прыйсці да яго ў любы час яшчэ раз.

1 сакавіка 1937 года Ю. М. Пэн трагічна загінуў ад рукі подлых забойцаў. Амаль увесь Віцебск ўдзельнічаў у пахаванні славутага майстра. Упраўленне па справах мастацтваў і Віцебскі горсовет вырашылі адзначыць памяць Ю. М. Пэна стварэннем у былой кватэры мастака галерэі яго імя, паставіць на магіле помнік і прысвоіць імя Пэна адной з вуліц Віцебска — горада, дзе мастак пражыў сорак год і які знайшоў самы шырокі адбітак у яго творчасці.

Два годы патрабавалася, каб адкрыць мастацкую галерэю, але мы ўпэўнены, што Віцебскае абласное ўпраўленне па справах мастацтваў возьме на сябе ініцыятыву і ў самы кароткі час ажыццявіць гэту справу. На Сямёнаўскіх могілках Віцебска з вялікімі цяжкасцямі можна знайсці цяпер магілу Ю. М. Пэна. Яна не абгароджана і на ёй няма ніякага надпісу. Пабудова помніка на гэтай магіле павінна стаць справай гонару мастакоў БССР. І, нарэшце — адной з вуліц Віцебска, якая знайшла найбольшы адбітак у творчасці Ю. М. Пэна, трэба ўжо прысвоіць яго добра знаёмае совецкаму народу імя.

Ю. ВІЦЬБІЧ.

Віцебск (наш. кар.)

АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЦЬ РАШЭННІ XVIII З'ЕЗДА ВКП(б)

Выходзячы з пастаноў XVIII з'езда ВКП(б), пярвічная партарганізацыя работнікаў тэатра і кіно Бабруйска пачала ўдзяляць больш увагі выхаванню камуністаў, комсамольцаў і беспартыйных работнікаў.

З вялікім уздымам партыйныя і непартыйныя большэвікі вывучаюць гісторыю нашай слаўнай комуністычнай партыі. Днямі на апошнім партыйным сходзе работнікі мастацтваў абмяняліся вопытам самастойнага вывучэння «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Дырэктар калгасна-саўгаснага тэатра, кандыдат партыі тав. Эпштэйн расказаў аб тым, што ён ужо вывучыў і законспекціраваў першыя тры раздзелы гісторыі ВКП(б).

— Пры вывучэнні гісторыі партыі, — гаворыць тав. Эпштэйн, — я карыстаюся першакрыніцамі, творамі класікаў марксізма-ленінізма, прапагандысцкімі матэрыяламі, кансультацыямі, якія друкуюцца ў журналах і газетах.

Актор калгасна-саўгаснага тэатра, кандыдат партыі тав. Кімберг самастойна вывучыў першыя чатыры раздзелы гісторыі партыі. Многія работнікі кіно і тэатраў рэгулярна наведваюць лекцыі і кансультацыі, якія бываюць у Доме партсаветы (таварышы Раскін, Грыбоўскі, А. Уланаў і інш.).

Пасля XVIII з'езда партыі адчуваецца асабліва вялікая цяга совецкай інтэлігенцыі, работнікаў кіно і тэатраў у рады партыі Леніна—Сталіна. Пяць работнікаў тэатра і кіно падалі заявы аб уступленні ў партыю.

І. Ц. СТЭЛЬМАК.

Бабруйск.

ПЕРШЫЯ МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ ДЛЯ АФАРМЛЕННЯ ВЫСТАЎКІ

Учора Беларускі мастацкі камбінат накіраваў у Маскву на Ўсесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку першыя работы для мастацкага афармлення беларускага павільёна: скульптуру «Ленін і Сталін» заслужанага дзеяча мастацтваў Азгура, скульптуру Орлова — «Пагранічнік і калгасніца», разьбу па дрэву Івінскага і Рабіновіча, якая адлюстроўвае калгаснае багацце, 12 шчытоў інкрустацыі брыгады Чарнецкага і інш.

СКУЛЬПТАР А. В. ГРУБЭ ПРЫНЯТ У ПАРТЫЮ

7-га чэрвеня сход партыйнай арганізацыі Саюза совецкіх мастакоў прыняў кандыдатам у члены ВКП(б) заслужанага дзеяча мастацтваў БССР скульптара Аляксандра Васільевіча Грубэ.

Выступаўшыя на сходзе т.т. Азгур, Карабан, Гаўрыленка, Пашкевіч і іншыя адзначалі не толькі творчы рост тав. Грубэ, як мастака-рэаліста, але і вялікую грамадскую работу, якую ён праводзіць па арганізацыі калектыва мастакоў па вырашэнне важнейшых творчых пытанняў совецкага мастацтва. Выступаўшыя адзначылі таксама блізасць тав. Грубэ да партыйнага жыцця калектыва мастакоў, яго гарачае імкненне да авалодання тэорыяй марксізма-ленінізма і актыўны ўдзел у ажыццяўленні партыйнай лініі ў пытаннях развіцця соцыялістычнага мастацтва.

ТКАНІНА ДЛЯ АФАРМЛЕННЯ БЕЛОРУСКАГА ПАВІЛЬЁНА

Калгасніцы-ткачыхі Марыя Андрэеўна Ліпай (Уздзенскі раён), Елізавета Іванаўна Івашка (Пухавіцкі раён), Аляксандра Нікіфараўна Мешачок і Аляксандра Сямёнаўна Серада (Чырвона-Слабодскі раён), Анна Якімаўна Семашка (Капыльскі раён) са сваімі брыгадамі, куды ўвайшлі 20 калгасніц-ткачых, закончылі і здалі Дому народнай творчасці БССР 210 метраў тканіны для афармлення беларускага павільёна на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Тканіна пойдзе на афармленне аддзелаў «Заможнасць», «Ільнаводства» і «Зярно», а таксама для абіўкі крэслаў і стэндаў.

Тканіна зроблена з ільну, шоўку і бавоўны і дае яркае ўяўленне аб беларускім народным арнаменце. Расцветка тканіны зроблена паводле эскізаў мастакоў Алтуф'ева і Станкевіча.

Апрача зданага заказа, ткачыхі БССР рыхтуюць для беларускага павільёна Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі рад каштоўных падарункаў — сарветы, дываны і інш.

КАЛГАСНЫ ДРАМГУРТОК

У калгасе імя Варашылава, Казіміраўскага сельсовета, Жлобінскага раёна, працуе драматычны гурток. Гурток падрыхтаваў канцэрт, паказ якога карыстаецца поспехам у калгаснікаў. Кіруе гуртком настаўнік В. Саўдар.

Плённа працуюць у самадзейным гуртку А. Бараноўскі, вучаніцы Кісялёва, Асташкевіч і інш.

Г. КОЖЫЧ, В. ПАГОДЗІН.



З перасовачнай выстаўкі ленінградскага рускага музея. Пейзаж «На возеры» работы засл. дзеяча мастацтваў І. Грабара.

Фота І. Каплінскага.

ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ Л. А. АЛЬПЕРОВІЧА

Сёння, калі наша краіна шчасліва квітнее пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, калі перад совецкімі мастакамі адкрыты бязмежныя магчымасці для творчых дзярзанняў, мы з павагай і любоўю ўспамінаем аб тых старых мастаках, якія ў змрочныя годы царызма закладалі аснову дэмакратычнага, народнага мастацтва ў Беларусі. Звяртаючыся ў мінулае, мы бачым выдатны і абаяльны вобраз Ю. М. Пэна, стваральніка выдатнай галерэі соцыяльных партрэтаў дарэвалюцыйнай Беларусі. Піонерамі рэалістычнага выяўленчага мастацтва ў дарэвалюцыйнай Беларусі разам з Пэнам выступалі і менскія мастакі — Я. М. Кругер і Л. А. Альперовіч.

Жыццё і творчасць Л. А. Альперовіча — прыклад бязмежнай любві і аддансці мастацтву. На прыкладзе жыцця гэтага мастака мы, шчаслівыя сучаснікі сталінскай эпохі, з усёй відавочнасцю можам назіраць, у якіх цяжкіх умовах соцыяльнага ўціску прыходзілася жыць і працаваць мастакам дарэвалюцыйнай Расіі, а тым больш мастакам Беларусі — адсталай і прыгнечанай калоніі рускага царызма.

Леў Абрамавіч Альперовіч нарадзіўся ў 1873 годзе ў беднай яўрэйскай сям'і, у мястэчку Курэнец на Віленшчыне. У 1880 годзе Альперовіч пераязджае з бацькамі ў Менск. Тут бацька аддаў яго ў ешыбот. Але хлопчык цікавіцца іншым. З ранніх год Альперовіча цягнула да малявання, ён марыў стаць мастаком. Бацька, з-за сваёй беднасці, вядома, не мог дапамагчы яму ў гэтым. Тады 16-гадовы юнак пакідае дом і едзе ў Вільню, дзе паступае ў школу малявання. Вучыцца было не лёгка. Сродкі для існавання прыходзілася здабываць выкананнем грашовых заказаў і ўрокамі.

Пасля сканчэння віленскай школы Альперовіч едзе ў Одэсу, дзе прадаўжае сваю адукацыю таксама ў школе малявання. Ён жыве ў сутарэнні, перабіваючыся прыватнымі заказамі і ўрокамі. У Одэсе Леў Абрамавіч знаёміцца з бытам працоўнага люду, піша партрэтныя эцюды рыбакоў, каменшчыкаў і марскія эцюды. Усе гэтыя работы гавораць аб вялікіх жывапісных даных пачынаючага мастака.

Пасля сканчэння одэскай школы Альперовіч у 1895 годзе паступае ў Пецербургскую Акадэмію мастацтваў. Не лёгка яму было вучыцца ў Акадэміі. Ён добра вучыўся па спецыяльных дысцыплінах, але яму, відаць, нехапала агульнаадукацыйных ведаў. Так, у 1899 годзе Льву Абрамавічу трэба было трымаць пераэкзаменоўку па аднаму з агульнаадукацыйных прадметаў. Альперовіч паехаў на лета ў Менск. Большую частку канікулаў ён правёў у Астрашыцкім Гарадку. Тут ім быў напісан рад эцюдаў і партрэтных работ. Па незалежачых ад Альперовіча прычынах паведамленне аб яўцы на пераэкзаменоўку ў Акадэмію даходзіць да яго са спазненнем. Леў Абрамавіч спазніўся і быў выключан з Акадэміі. З-за гэтага Альперовіч страціў і права жыхарства ў Пецербургу. Але ён не разгубіўся, вярнуўся ў Менск і, узяўшы лепшыя свае работы — «Партрэт музыканта», «Партрэт спячага старога» і інш., паехаў у Пецербург, да Ільі Ефімавіча Рэпіна. Работы Альперовіча спадабаліся вялікаму мастаку, і Рэпін узяў Альперовіча да сябе ў майстэрню. Пад кіраўніцтвам вялікага рэаліста ён працаваў і вучыўся ў Акадэміі, якую і скончыў у 1902 годзе.

У акадэмічныя годы Альперовіч напісаў мноства эцюдаў, асабліва шмат працаваў ён над малюнкам. Яго дыпломнай работай была карціна «Вечар у сям'і». У акадэмічныя-ж годы напісан рад партрэтаў, у прыватнасці «Партрэт мастака» — партрэт аднаго з пецербургскіх таварышаў Альперовіча.

У 1903 годзе Альперовіч стала пасяляецца ў Менску. З Менскам звязана ў асноўным усё яго творчае жыццё. Альперовіч напісаў шмат эцюдаў і пейзажаў зялёных ускраін горада, шмат партрэтных эцюдаў. Усе гэтыя работы кажуць аб тым, што Альперовіч любіў беларускую прыроду, што яго, як і віцебскага мастака Ю. М. Пэна, глыбока хваляваў быт працоўнага люду і што ён з хваляваннем сачыў за наспяваўшымі ў краіне рэвалюцыйнымі падзеямі.

На выстаўцы работ Л. А. Альперовіча, якая зараз адкрыта ў Менску, шырока прадстаўлены малюнкі Альперовіча, на якіх мы бачым беларускіх сялян, менскіх рамеснікаў і інтэлігентаў.

У годы рэвалюцыі 1905 года Альперовіч працуе над карцінай «Сходка падпольшчыкаў-рэвалюцыянераў». Дзе знаходзіцца гэта карціна — невядома, на выстаўцы паказваецца толькі адзін эскіз і два эцюды да гэтай карціны. Мяркуючы па эскізу, на Альперовіча тут мелі моцны ўплыў мастакі-перадвіжнікі.

Партрэтныя работы Альперовіча не вылучаюцца глыбінёй соцыяльнай і псіхалагічнай характарыстыкі, з якой мы сустракаемся ў партрэтных работах яго настаўніка Рэпіна і ў радзе работ Пэна, але па жывапісу партрэты Альперовіча ўяўляюць значную цікавасць.

З партрэтных работ Альперовіча вылучаецца ўжо спамянуты вышэй «Партрэт музыканта», а таксама партрэты «Жанчына ў блакітным» і «Партрэт жонкі». «Партрэт музыканта» напісан з вялікім майстэрствам. Шырокую манеру пісьма, тонкае разуменне колеру і формы знаходзім мы ў гэтым партрэце. Цікавы па жывапісу і «Партрэт жонкі».

Асабліва глыбока Альперовіч адчуваў і разумеў беларускую прыроду. У большасці яго менскіх эцюдаў і пейзажаў, напісаных у Астрашыцкім Гарадку і Халяўшчыне, адчуваецца вялікая жыццёрадаснасць, глыбокая лірычнасць, высокая паэтычнасць. У сваіх эцюдных работах Альперовіч паказаў сябе глыбокім мастаком і тонкім каларыстам.

На творчасці Альперовіча, як гэта паказвае выстаўка яго работ, сказаўся ўплыў многіх школ яго часу. У карціне «Лунная ноч», відаць, сказаўся ўплыў мастакоў «Мира Искусств», а ў радзе партрэтных і пейзажных эцюдаў адчуваецца ўплыў французскіх імпрэсіяністаў. З гэтага відаць, што Альперовіч, глыбока адчуваючы і разумеючы паэзію фарбаў прыроды, упарта працаваў над хвалюючымі яго праблемамі жывапісу. У асноўным-жа творчасць Альперовіча рэалістычная, — ён выступае перад намі ў сваіх работах як паслядоўнік рускага рэалістычнага жывапісу, У большасці сваіх партрэтных работ Альперовіч бясспрэчна наследуе традыцыі вялікіх рускіх партрэтыстаў І. Рэпіна і В. Серова.

Альперовічу не ўдалося дажыць да нашага часу. Рэакцыйны царызм, шавіністычны гнёт, дзікасць і мракабесее правіцеляў старой Расіі і, нарэшце, рэўматызм, зламілі сілы мастака і ў 1913 годзе, 40 год ад роду Леў Абрамавіч памёр.

Ён памёр непрызнаным. Губернскія чыноўнікі, менскія купцы і мястэчковыя заводчыкі і не маглі прызнаць Альперовіча, ім быў глыбока чужым свет яго герояў, свет людзей працы і заўсёды цудоўнай прыроды.

Альперовіч да апошніх дзён свайго жыцця застаўся верным мастацтву і сваім ідэалам. Ён не пайшоў на паклон да губернскіх багацеяў і чыноўнікаў, памёр у беднасці. Не маючы сродкаў для існавання, ён некаторы час працаваў табельшчыкам на будаўніцтве. У рэдкіх выпадках ён выстаўляў свае работы на менскіх выстаўках, але яго замоўчвалі. Такі быў лёс не толькі Альперовіча, але і многіх таленавітых людзей з народа, якім перашкаджаў жыць, тварыць і расці капіталістычны лад старой Расіі.

Працоўныя Совецкай Беларусі, а разам з імі і мы, беларускія мастакі, выклікалі да жыцця забытую творчасць Льва Абрамавіча Альперовіча. Творчасць гэтага мастака блізкая нам.

Успамінаючы аб трагічным лёсе Альперовіча, мы, совецкія мастакі, жывучы і працуючы ў шчаслівай краіне соцыялізма, у краіне квітнеючага мастацтва, наследуем усё лепшае, што пакінуў нам у сваёй творчасці Леў Абрамавіч — адзін з піонераў беларускага рэалістычнага выяўленчага мастацтва.

Мастак М. І. МАНАСЗОН.

М. ЛАРЧАНКА

ПАЭМЫ ВЯЛІКАЙ МАСТАЦКАЙ СІЛЫ

Пра „Новую зямлю“ і „Сымона музыку“ Я. Коласа

Вульгарны соцыялагізм, які прышоў у совецкае літаратуразнаўства і крытыку праз антымарксісцкую «школку» Пакроўскага, прынёс нашай літаратуры шмат шкоды. Ігнарыруючы гістарычны падыход у аналізе і адзнцы мастацкіх твораў, вульгарызатары адносілі вялікія паэмы Якуба Коласа — «Новую зямлю» і «Сымона музыку» у лагер варожых нашай рэчаіснасці твораў. З лёгкай рукі вульгарызатараў, гэтыя паэмы Я. Коласа яшчэ і зараз многімі выкладчыкамі і рэдактарамі мастацкай літаратуры адзньваюцца няправільна. Вось чаму ўзнікае неабходнасць растлумачэння ідэйна-мастацкай сутнасці названых паэм.

«Новая зямля» — высокамастацкі рэалістычны твор, у якім глыбока і праўдзіва паказана жыццё працоўнага беларускага сялянства ў канцы XIX стагоддзя, калі ў краіне панавала дзікая самаўладна-памешчыцкая дыктатура і вельмі моцнымі былі перажыткі прыгонніцтва. У паэме створаны тыповыя вобразы (Міхал, Антось, Марцін, Ганна), праз якія паэт выразіў думы і надзеі працоўных сялянскіх мас аб свабодзе, жаданне і імкненне народа вызваліцца з-пад гнёту царызма і памешчыкаў.

Вялікая маса сялянства таго часу страсна ненавідзела памешчыкаў, усёй душой абуралася супроць царскіх парадкаў, але не ведала рэальных шляхоў барацьбы за сваё вызваленне. Вось чаму і Міхал у «Новай зямлі» ідзе да вызвалення з-пад панскай залежнасці сваім шляхам, шляхам куплі ўласнай зямлі: «Купіць зямлю, прыдбаць свой кут, каб з панскіх вынутацца пут». Гэта думка аб набыцці ўласнай зямлі, заўладаўшая ўсёй істотай Міхала, з'яўляецца тыповай і характэрнай для вялікай часткі сялянства, якое жыло і мучылася ва ўмовах патрыярхальнай адсталасці беларускай вёскі канца XIX стагоддзя.

Такім чынам, у вобразе Міхала не скажаецца гістарычная сапраўднасць, а, наадварот, — у ім рэалістычна адлюстраваны думы і жаданні, імкненні і надзеі, сіла і слабасць многамільённай масы сялянства.

Міхал з'яўляецца тыповым прадстаўніком гэтай сялянскай масы. Ён усім сэрцам ненавідзіць паноў, абураецца супроць соцыяльных несправядлівасцей тагочаснага грамадства, усёй душой імкнецца вызваліцца з-пад панскай няволі, але не ведае сапраўднага шляху свайго вызвалення. Міхал жыве яшчэ настроямі патрыярхальнага сялянскага дэмакратызма. Ён усё сваё жыццё марыць набыць валоку ўласнай зямлі, каб пазбавіцца панскай апекі. Але гэта мара, як сцвярджае і сам Я. Колас у адным з лірычных адступленняў паэмы, з'яўлялася ў тагочасным грамадстве ілюзорнай, а сам шлях вызвалення, выбраны Міхалам, быў фальшывым і трагічным. У гэтым трагічным становішчы Міхала паказан трагізм жыцця беззямельнай масы сялянства ў пасляэформенную эпоху. Тут Я. Колас не адступаў ні на ёту ад жыццёвай праўды і тым самым стварыў тыповы мастацкі вобраз, які мае вялікае гістарычнае і пазнавальнае значэнне.

Па свайму эмацыянальнаму пафасу і ідэйнай накіраванасці да Міхала прымыкаюць такія персанажы, як Антон, Ганна і Марцін. Усе яны жывуць такімі-ж думкамі і імкненнямі, як і Міхал, але ў многіх адносінах дапаўняюць апошняга. Так, Антось ненавідзіць не толькі асобных паноў-крыўдзіцеляў, а і ўвесь эксплаататарскі лад, дзе працоўны народ прыгнечан і жыве ў страшнай беднасці. Антось не можа пагадзіцца з тым становішчам, што вялікія прыгожыя прасторы палёў, якімі ён захапляецца, едучы ў Вільню, належаць «цару-гаспадару», а не сялянству, якое жыве ў голадзе і няшчасці. Ганна згодна з думкамі і імкненнямі Міхала і Антося, але мае свой погляд на рэчы. Яна папракае Антося і Міхала за тое, што яны ў сваіх адносінах да пана бываюць вельмі пакладзістымі і таму ў многім самі вінаваты. Па думцы Ганны Міхал і Антось павінны дзейнічаць больш рашуча і ніколі не зважаць пану, калі не хочуць быць пакрыўджанымі. Калі Міхал у сваёй нянавісці і шчырым абурэнні супроць паноў часамі аддаецца песімістычным настроям, дык Марцін цвёрда верыць у тое, што настане час, калі паны, як «злое племя», будуць знішчаны.

У кожным характары разгледжаных персанажаў ёсць штосьці ад геройнага рускага і беларускага эпасу. Усім разгледжаным персанажам паэмы ўласціва псіхалагічная рыса непрымірымай нянавісці да польскіх паноў і страснага імкнення да свабоды, да незалежнасці. У вобразах Міхала і Ганны ўвасоблены рысы стойкасці, вынослівасці і шчырай беларускай гасціннасці. Любоў да працы, гаспадарская акуратнасць і старраннасць характарызуюць Антося, Міхала і Ганну. У вобразах Антося і Міхала жыве ва ўсёй сваёй яркасці мудрасць і дасціпнасць народа, народны гумар і знішчальны сарказм.

Вобразы польскіх паноў у «Новай зямлі» паказаны выключна ў сатырыстычным плане. У мастацкай характарыстыцы паноў Я. Колас вельмі часта прыбягае да народнага сарказму, які ствараецца на аснове каларытных і меткіх метафар і параўнанняў, Гнеўна выражан праклён і помста народа сваім спрадвечным ворагам.

Ва ўсёй сваёй разнастайнай чароўнай прыгажосці ўстае перад намі з паэмы «Новая зямля» беларуская прырода. Усе поры года: зіма, вясна, лета і восень, Уся прырода, з яе задуменнай прывабнасцю — лес, луг, поле, жніво, сенакос, рэчкі, крынічкі, узгоркі, нізіны, балоты, блакітнае неба, зоркі, хмары, смуглы далягляд, навальніца, дождж, снег, мароз — прачуты і таленавіта, з задушэўным лірызмам апісаны Я. Коласам.

У апісанні з'яў прыроды паэта перш за ўсё цікавіць іх эстэтычны бок, іх аб'ектыўнае хараство, якое з'яўляецца ўнутранай тэмай коласаўскага пейзажа. Хараство прыроды, як унутраная тэма пейзажнай зарысоўкі, паказваецца Коласам для таго, каб ярчэй адцяніць непрыгляднасць і ўродлівасць жыцця беларускага сялянства пад прыгнётам магнатаў Радзівілаў і царскага самаўладства. Так, у раздзеле «Летнім часам» паэт рысуе тыповы пейзаж беларускага лета і перш за ўсё падрабязна спыняецца на чароўным харастве летніх з'яў прыроды. У коласаўскім пейзажы многа сонечнай яркасці, жыццёвай красачнасці і каларытнасці, чаруючай душу прыгажосці. Усё гэта паэт паказвае для таго, каб вялікае хараство прыроды супроцьпаставіць соцыяльнаму ладу, дзе людзі поўнасцю не маглі адчуваць і бачыць красу палёў і лясоў, бо гэтыя апошнія былі ўласнасцю пана Радзівіла.

Я. Колас — шчыры гуманіст. Ён бязмежна любіць чалавека, якога няшчадна і бязлітасна прыгнятае самадзяржаўнакапіталістычнае грамадства, дзе пануе такі здзек з чалавека, што «не сцерпіць нават і каменне, каб не заплакаць з таго здзеку, што чалавек звер чалавеку, так злосна чыніць, неўспагадна». І паэт не можа прымірыцца з капіталістычным грамадскім ладам: «Ды покі будзе сэрца біцца, яно не можа пагадзіцца ні з гэтым гвалтам, ні з бядою над нашай роднаю зямлёю». Я. Колас ненавідзіць ворагаў народа, яго прыгнятальнікаў.

Такім чынам, паэма «Новая зямля»—гэта мастацкая эпапея, дзе ў высокапаэтычнай форме рэалістычна паказана жыццё працоўнага беларускага сялянства ў канцы XIX стагоддзя, яго быт, норавы і звычаі; дзе праўдзіва выражаны думы і надзеі, імкненні і спадзяванні сялянскіх мас аб свабодзе і вызваленні з-пад гнёту царызма і памешчыкаў.

Па свайму чыстаму і яркаму дэмакратызму, па высокаму паэтычнаму майстэрству да паэмы «Новая зямля» блізка прымыкае і паэма «Сымон музыка».

Паэма «Сымон музыка» у яе трэцяй рэдакцыі з'яўляецца высока-мастацкім творам, дзе праўдзіва паказаны істотныя рысы капіталістычна-памешчыцкай рэчаіснасці.

Асноўная тэма «Сымона музыкі» — жыццё таленавітых дзяцей у дарэвалюцыйнай беларускай вёсцы. Гэта тэма з усёй мастацкай паўнатой раскрываецца на вобразе высока-адаронага мастацкімі здольнасцямі сялянскага хлапчука Сымона. Сымон — свабодалюбівая натура, але ён вымушан жыць пад прыгнётам і цярпець бесчалавечныя здзекі з боку эксплаататараў — карчмара Шлёмы і крывадушнага польскага пана Галыгі. Ён імкнецца да справядлівасці, да волі, але нідзе іх не знаходзіць. І ён узнімаецца да разумення неабходнасці змагання з царскай рэчаіснасцю:

Ой, не, дзедку: проціў сілы
Можна ставіць толькі сілу,
Калі хочаш ты ўстаць з пылу,
Калі цягнуць з цябе жылы.

Сымон — не байранічны тып, падобны пушкінскаму Алеко, які «лишь для себя хочет воли». Ён не эгаіст. Сымон, які марыць аб уласнай свабодзе, ні на хвіліну не забывае аб сваёй радзіме, аб прыгнечаным народзе. У Сымона «млела сэрца аб айчыне, хоць і цяжка ў ёй было». Ён шчыры гуманіст, які любіць свой народ і жадае вызваліць яго з капіталістычнай няволі. Ён імкнецца да таго, каб «людзей дабром атуліць, каб палёгку людзям даць». Сымон — аптыміст. Ён верыць у прыход светлай будучыні і заяўляе: «У свеце гора і блуканне; дыканец ёсць усяму».

Сымон смела і адкрыта гаворыць пану Галыгу, што набліжаецца вялікая бура народнага гневу, якая знішчыць панскі дом, бо ён прынёс вялікае ліха і гора працоўнаму народу.

Малюючы вобраз Сымона-музыкі, Я. Колас ставіць і ў духу эстэтыкі рэалізма вырашае праблему мастацтва. Канкрэтным паказам грубых здзекаў эксплаататараў з адаронага мастака Сымона Я. Колас сцвярджае, што капіталістычная рэчаіснасць варожа сапраўднаму мастацтву, не спрые развіццю народных талентаў, а, наадварот, знішчае іх, з'яўляецца перашкодай для развіцця народнага мастацтва. Ідэя, што сапраўднае мастацтва павінна быць народным, павінна быць песня звязана з жыццём народа, добраахвотна служыць народу, — выражана ў задушэўнай мелодыі музыкі Сымона.

У абрысоўцы вобраза Ганны, як і ў абрысоўцы вобраза Сымона, пераплятаюцца рэалізм з жыццёвым рамантызмам, — тым рамантызмам, які ўласцівы юнацкім перажыванням чалавека.

Ганна — шчыры і задушэўны друг Сымона. Яны жывуць адзін адным. Глыбока чалавечная і благародная любоў звязвае іх у неразлучнае цэлае. Іх любоў — гэта любоў сэрца і душы, любоў, узнікнуўшая на ўзаемным разуменні і шчасці. Але гэтаму вялікаму і прыгожаму чалавечаму пачуццю кахання і дружбы перашкаджае капіталістычная рэчаіснасць.

Вобраз дзеда Данілы дапаўняе Сымона. Даніла страсна ненавідзіць паноў, любіць сваю радзіму і верыць у прыход соцыяльнай рэвалюцыі. Па сваіх настроях ён з'яўляецца тыповым сялянскім рэвалюцыянерам. Дзед Даніла — гэта вобраз, у якім выражаны спадзяванні і мудрасць народа. І таму кожнае слова Данілы агорнута народнай рэвалюцыйнай сімволікай. Мудры характар дзеда Данілы раскрываецца ў размове Данілы з Сымонам. Расказ Данілы аб таемных стуках сякер у цёмным гушчары з'яўляецца сімвалічнай карцінай надыходу народнай рэвалюцыі.

Вершаваная рытміка і слоўна-выяўленчыя сродкі «Сымона музыкі» бяруць свае вытокі з народнай творчасці і арганічна звязаны з ёю. Рытміка паэмы прасякнута народнай песеннасцю і па свайму метрычнаму складу надзвычай разнастайная.

Разнастайнасць вершаваных рытмаў і іх адпаведная сувязь з тэмай, вобразамі і настроямі аўтара сведчыць аб класічнай дасканаласці коласаўскага верша ў паэме «Сымон музыка».

«Сымон музыка» — твор вялікай паэтычнай сілы, твор, дзе праўдзіва, у высокамастацкай форме паказаны рысы капіталістычнай рэчаіснасці, якая бесчалавечна душыла і знішчала народныя дараванні, не давала магчымасці развівацца сапраўднаму народнаму мастацтву. Гэта твор, які мае гістарычнае, пазнавальнае і велізарнае выхаваўчае значэнне, бо ён сваім тонкім паказам псіхалогіі мастака, сваім пранікнёным паказам хараства прыроды прывівае нашым дзецям мастацкі густ, сваім глыбокім пафасам нянавісці да ворагаў працоўных і любві да народа і радзімы вучыць нашу моладзь таму, як патрэбна ненавідзіць ворагаў і любіць свой народ і сваю радзіму.

МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ

ПРА НЕКАТОРЫХ УГРУМ-БУРЧЭЕВЫХ... ЦІ ПРЫГОДЫ АДНАГО „ЛІНГВІСТА“

«В упоении гордости он вперял глаза в небо, смотрел на светила небесные, и, казалось, это зрелище приводило его в недоумение.

— Зачем? — бормотал он чуть слышно и долго-долго о чем-то думал и что-то соображал».

М. Е. Салтыкоў-Шчадрын.

Так пісаў геніяльны рускі сатырык аб адным са славутых сваіх герояў Угрум-Бурчэеве. Гэты выдатны герой, не спакушаны не толькі ў высокіх навуках і мастацтвах, але і наогул не абцяжараны звычайным чалавечым розумам, заўсёды прыходзіў у крайняе недаўменне, калі траплялася яму сустрэць што-небудзь альбо нябачанае ім, альбо незразумелае яму, альбо што-небудзь такое, што не паддавалася яго бурчэеўскай уладзе. Убачыць, скажам, сонца і адразу грозна пытае:

— Зачым?

Убачыць раку і адразу надзьмецца:

— Зачым? Ліквідаваць!

Убачыць зоры на небе:

—Зачым? Хто, моў, без майго дазволу на неба іх панавешваў? І куды квартальныя глядзелі?

І адразу прымаў якое-небудзь экстраардынарнае рашэнне: ці разбурыць горад, ці ліквідаваць раку, ці яшчэ што-небудзь такое карыснае, бурчэеўскае. Канешне, уся гэта многатрудная дзейнасць канчалася звычайна канфузам. Патушыць сонца яму не ўдавалася, прыродныя стыхіі не падначальваліся, а звычайная рака проста, можна сказаць, над ім насмяялася.

Але трэба аддаць справядлівасць Угрум-Бурчэеву: ён усё-ж-такі «что-то соображал». І калі ненавісная рака ніяк не хацела ліквідавацца, Угрум-Бурчэеў прыняў параўнальна разумнае рашэнне. Ён раптам «пранозліва замычэў і парыўчата павярнуўся на каблуку:

— Напра-ва круг-гом! За мной! — раздалася каманда».

Не захацела рака пайсці ад яго, ну дык што-ж, ён пойдзе ад яе... Пайшоў... І паступіў разумна. Усё-такі, ён «что-то соображал». На вялікі жаль, у сучасных Угрум-Бурчэевых (яны яшчэ трапляюцца часам, як перажытак) з «соображением» тугавата. Глядзіш часам на многатрудную і шматпакутную дзейнасць іншага такога Бурчэева і дзіву даешся: чалавек, можна сказаць, горы ваpочае і хоць-бы табе капельку «соображения».

Даўно ўжо ідзе ў нас дыскусія аб правапісе беларускай мовы, аб самой мове. Справа патрэбная, даўно наспеўшая, патрабуючая свайго вырашэння, вырашэння сур'ёзнага, прадуманага, абгрунтаванага. Паступае многа добрых і дзелавых прапаноў. Відаць, што людзі самым сур'ёзным чынам прадумваюць гэтую праблему, якая мае глыбокае дзяржаўнае значэнне, і к вырашэнню яе падыходзяць іменна як дзяржаўныя дзеячы, як совецкія грамадзяне. Але ва ўсёй гэтай дыскусіі раздаюцца сям-там і асобныя галасы, якія нагадваюць нам бурчэеўскія вокрыкі: «Зачым? Ліквідаваць!».

З даўніх часоў, можа 'шчэ ад Евы, а можа пазней, прывучыліся беларусы акаць. Ад самай калыскі, можна сказаць, акае наша нацыя і хоць-бы што. Кажуць нават, што гэта — адна з галоўнейшых асаблівасцей беларускай мовы. І па ўсяму відаць, што правільна кажуць. Але Угрум-Бурчэеву гэта не да спадобы:

— Зачым? Наакаліся, даволі, хопіць...

Другі «лінгвіст» дазваляў пакінуць у беларускай мове толькі слова «бульба», як абсалютна бясспрэчнае і нідзе, на яго думку, не запазычанае. Усе другія словы, па ягонаму, аднекуль запазычаны і ўсе яны паланізмы. Наогул, знаходзяцца ахвотнікі ўзбагачаць польскую мову за кошт беларускай і ўсякае незразумелае ім слова аддаваць палякам. Гэта ніхто іншыя, як прыхільнікі прыбяднення ажабрачвання мовы, людзі проста не паважаючыя ні сябе, ні народ. Зразумела, што паланізмы ёсць яшчэ ў мове, асабліва ў літаратурнай, ад іх мова ачышчаецца і павінна ачышчацца ў далейшым. Але трэба ведаць, што не ўсякі «паланізм» ёсць паланізм, не ўсякае незразумелае каму-небудзь слова павінна быць паланізмам.

Тут таксама патрэбна «соображение».

Некаторыя «лінгвісты» намагаюцца абмежаваць мову дыялектам той вёскі, дзе яны радзіліся. Случак адстойвае сваю мову, рагачавец — сваю. Саматужнічаюць. Іншыя-ж «лінгвісты» пад сцягам рэформы правапісу залязаюць у такія дэебры, у якіх гэты правапіс робіцца яшчэ больш заблытаным, чымся цяпер.

Але ўсіх гэтых «лінгвістаў» перакрыў паважаны рэдактар Ладыжын, аб якім наша газета мела ўжо гонар пісаць не так даўно на сваіх старонках. Тады расказвалася, як таварыш Ладыжын паймаў за хвост слова «грамада» і што з таго «ўлаўлення» вышла. Дарэчы, павінен напомніць Ладыжыну, што «крамольнае» слова «грамада» ўжываў яшчэ ў свой час вядомы і Ладыжыну Салтыкоў-Шчэдрын, прычым ужываў даўным-даўно, калі нават дзяды нашы пра нацдэмаў не чулі (раю пачытаць кнігі Салтыкова-Шчэдрына, III том, выдання 1905 года, стар. 524, шосты радок зверху). Прычым ужываў на рускай мове, бо па-беларуску ён не пісаў і да нацдэмаў не меў ніякага дачынення, таксама, як і Даль (глядзі яго слоўнік, том I, стар. 408), таксама, як і многія рускія пісьменнікі сучасныя, і пісьменнікі-класікі. Адным словам, патрэбна было выключнае «бодрение» ў мыслях, каб слова «грамада» зрабіць словам крамольным.

Праўда, пазнаёміўшыся з чарговымі «навуковымі» работамі новаспечанага лінгвіста, мы пераканаліся, што Ладыжын можа «падкаваць» любое слова. Захоча слова «вада» зрабіць нацдэмаўскім— зробіць. Захоча яго ў паланізмы загнаць— загоніць. І аргументы прыдумае, ды такія аргументы, што можа ўвесь свет здзівіць і славу нажыць. Другія там цікавяцца коранем слова, усякімі орфоэпіямі, суфіксамі, прэфіксамі і іншымі тонкасцямі слоўнай навукі. У Ладыжына гэта прасцей. І ў прастаце сваёй проста геніяльна. Галоўны аргумент — фантазія. А вядома, як казаў Салтыкоў-Шчадрын, «нішто не акрыляе так фантазію, як адсутнасць фактаў». І вось, папраўшы ўсякія факты і самыя элементарныя законы чалавечага мышлення, лінгвіст наш прыходзіць, што называецца, у «раж» і пачынае дзівіць свет нечуванымі вынаходствамі і адкраненнямі. Трапіўся яму ў рукі пераклад на беларускую мову адной капітальнай работы, над перакладам якой працавала больш года група кваліфіцыраваных перакладчыкаў. Зірнуў на работу лінгвіст і здзівіўся:

— Зачым?

Потым узяў у рукі пяро, паперу і ў два прысесты напісаў нешта падобнае і на брэд і на гутарку двухгадовых дзяцей. Аж на цэлыя трынаццаць старонак разышоўся, не шкадуючы ні паперы, ні чарніла, ні ўласных сіл і бадзёрасці. І што ні слова — то перл, што ні сказ— златавуст. Але не будзем галаслоўнымі, будзем трымацца за факты. Сустрэліся Ладыжыну словы «скарбы», «скарбніца» і «рушыў».

— Адкуль сіе? — падумаў «лінгвіст» і адразу «изрек»: «Слово «скарбніца» можно понимать как скорбь, а слово «рушыў» понимается как тронул, а не двинул вперед». Да некаторай ступені Ладыжын тут праў: для Мітрафанушкі ў свой час любая навука была ў вялікую «скорбь», а таму гэтай «скорбью» можна растлумачыць любое слова. Напрыклад, ёсць слова «розум». Для адных, якія валодаюць ім і разумеюць яго, розум ёсць розум. Для іншых-жа і розум можа сыйсці за «скорбь». Праўда, для слова «рушыў» Ладыжын дапусціў некаторую міласць: радкоў праз дзесяць ён піша: «слово «рухаць» надо понимать, как «ссориться». Адзін раз «двинул», другі раз «ссориться». Адзін раз думаў па метаду: «чаго мая левая нага жадае», другі раз па метаду: «чаго хоча мая правая нага». А ўвогуле вышла: «ні ў зуб нагой», як кажа народная прыказка.

Слова «падкрэсліў», як піша Ладыжын, «надо понимать, как крестить». «Вартасць» — это значит стеречь, а стоимость так и остается стоимостью». Назвы месяцаў прывялі Ладыжына проста ў гнеў. Усякія там сакавікі ды верасні нагналі на яго вялікую «скорбь». «Слово верас — это значит трава» — глыбокадумна піша лінгвіст. Правільна піша, верас сапраўды трава, аб гэтым і дзеці ведаюць. Але тыя-ж самыя дзеці ведаюць, што верасень ужо не трава, а назва месяца, у які звычайна пачынаецца вучоба, месяц, у якім пачынаецца тое дзеянне, калі «науки юношей питают, отраду старцам подают». А ў Ладыжына ні навукі, ні «отрады»...

Напалохала Ладыжына слова «зносіны». Па гэтаму повану прыводзяцца ім нават некаторыя «меркаванні». «Сношения» — «зносіны». Под словом сношение надо понимать как связь, соединение одного с другим, а слово «зносіны» — это значит снести», — так піша Ладыжын. Праўда, слова «снести», скажем «снести яйцо», перакладаецца ў нас, як «знесці яйцо». Рэдактару, асабліва незадачліваму, таксама можна «знесці» што-небудзь падобнае на яйцо. Але-ж, зносіны застануцца ўсё-ж зносінамі.

Слова «канаць» па-ладыжынску значыць «стонать». Слова «развага» ён ператварыў у «развешивание», «абсталяванне» зблытаў з «усталяваннем», «расквітаўся» па ягонаму — «выдаў квітанцыю» і г. д. і г. д. Вось упёрся ён у словы «рашучым чынам» і пачынае тлумачыць: «Слово «чин» — это значит начальник, а «образом» — это значит действием, показом». Адным словам, нельга «решительным образом» перакласці як «рашучым чынам», бо гэта, на думку рэдактара, скажэнне, і не простае, а самае злачыннае, нацдэмаўскае. А таго не ведае Ладыжын, што ў рускай мове ўжываюцца такія словы, як «чинить», «учинить», «починка», «почин» і г. д. Вось, скажам, сказ «бюрократ учинил безобразие». Усё гэта я прыводжу для таго, каб паказаць рэдактару, што ёсць цэлыя сотні рускіх слоў з коранем «чин» і азначаючыя дзейнасць, і беларускія словы «чыннасць», «чынам», і другія з'яўляюцца роднымі братамі гэтых рускіх слоў.

Але гэтага «лінгвіста» цяжка пераканаць. Вось ён з смеласцю, вартай Мітрафанушкі, заяўляе: «А вот тоже нацдемовские слова, которые засоряют белорусский язык». І дае пералічэнне гэтых «нацдэмаўскіх» слоў: «існаваць, тагочасным, дарэмна абураліся, пункт гледжання, чырвонай фарбай, чэрвень, жандар, стаўшыя раптам, колер, безагаворачнай салідарнасці» і г. д.

Што-ж тады застанецца ад беларускай мовы, калі амаль-што усе яе словы паважаны рэдактар прызнаў нацдэмаўскімі. Нават чыста рускія словы («безагаворачнай салідарнасці») і тыя палічыў нацдэмаўскімі (відаць, некуды спяшаўся і канчаткова заблытаўся ў трох соснах).

Пасля гэтага не так ужо страшна гучаць некаторыя яго безапеляцыйныя вывады і прысуды. Так, прачытаў ён сказ: «жудасныя, бядотныя і агідныя формы». Прачытаў, спужаўся, нахмурыў прасвятлёнае чало і чорным па беламу вывеў: «В этих трех словах выражен сгусток нацдемовщины».

Далей, што казываецца, ісці некуды. Я не пералічаю ўсіх несусветных бязглуздзіц старанна напісаных рэдактарам на 13 старонках рэцэнзіі. Некаторыя аргументы яго даюць скромны намёк на тую «навуквую» лабараторыю, з якой чэрпаў ён свае вывады. Так слова «прымус» («принуждение») ён пераблытаў з адной нявіннай кухоннай прыладай, на якой нашы паважаныя гаспадыні грэюць супы, гатуюць чай і робяць іншыя скромныя працэдуры. А калі сустрэўся рэдактар са словам «памылка», тут ён зноў скарыстаў сякія-такія гаспадарчыя асацыяцыі і глыбокадумна запісаў: «Слова «ошибка» и «памылка» нельзя понимать как единое. «Памылка»—это значит помойка, а ошибка так и останется ошибкой». Наконт «ошибки» правільна, яна застанецца «ошибкой». Памылка таксама застанецца памылкай, а вось у рэцэнзіі застанецца, як відаць, адна гэта несуразная «помойка», на якую ўскладаў такія вялікія надзеі рэдактар, не саромячыся абліць памыямі невядомае яму слова, невядомую яму мову.

Хацеў Ладыжын закончыць сваю «рэцэнзію» словамі аднаго з шчэдрынскіх герояў: «Вот, сударь мой, сколь далеко я виды свои простираю!», але па скромнасці змоўк, прабурчэўшы нешта незразумелае аб нацдэмаўскіх козпях і скажэннях.

Чым-жа можна растлумачыць з'яўленне такой арыгінальнай і непаўторнай працы ў галіне цяжкай і складанай навукі, як лінгвістыка?

Прычыны могуць быць розныя.

Першая прычына, што рэдактар, які так паважае ўсякія гаспадарчыя прылады, як прымус, памыйка, забыўся, відаць, на курэй, якія ў некаторых выпадках таксама могуць смяяцца.

Другая прычына — рэдактар забыўся на словы аднаго з шчэдрынскіх герояў, які гаварыў, і гаварыў надзвычай разумна:

«Ежели чувствуешь, что закон полагает тебе препятствие, то, сняв оный со стола, положи под себя. И тогда все сие, сделавшись невидимым, много тебя в действии облегчит».

Па сакрэту кажучы, Шчэдрын пад законам разумеў не толькі закон, але і звычайны чалавечы розум, без якога, як вядома, нельга рабіць ні адной справы, не кажучы ўжо аб рэцэнзіях...

І трэцяя прычына самая простая і звычайная. Імянуецца яна, мякка кажучы, галавацяпствам.

Прыхільнікам-жа гэтай пошасці геніяльны Шчэдрын даў такую характарыстыку:

«Головотяпами же прозывались эти люди оттого, что имели привычку «тяпать» головами обо все, что бы ни встретилось на пути. Стена попадется — об стену тяпают; богу молиться начнут— об пол тяпают».

Мову сустрэнуць — аб мову цяпаюць.

Ці не час пакінуць гэты не зусім, каб сказаць, дастойны і пачэсны занятак?

Без цяпання яно неяк лягчэй, весялей і разумней...



Удзельнікі дэкады кіргізскага мастацтва у Маскве. Народны артыст Кіргізскай ССР Каралаеў Саякбай, заслужаны дзеяч мастацтваў Кіргізскай ССР кампазітар В. Г. Ферэ, узнагароджаныя ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга; акын, народны артыст Кіргізскай ССР Орозаў Карамалдо, народны артыст Кіргізскай ССР Мусулманкулаў Малдабасан, узнагароджаныя ордэнамі «Знак Почета».

Л. ТАЛАЛАЙ

КАЛЯ КУЗНІ ДВА МАТРОСЫ...

Каля кузні два матросы
Ціха размаўляюць.
Баб паслухаць іх размову,
К ім я падбягаю.
І каваль Абрам выходзіць, —
Бараду выносіць.
З пад авечай чорнай шапкі
Выглядае проседзь.
На матросаў пазірае,
Моўчкі бровы хмурыць,
Чорным кіпцем выбівае
З люлькі попел буры.
«Колькі ты, каваль Абрамча,
Нацягнуў калёсаў?
Колькі выгнуў лемяшоў ты,
Змайстраваў атосаў?»
«Як паклаў вуголлі ўвосень —
Тут яны й зімуюць.
На франтах ваюе моладзь,
Старыкі ваююць.
І даўно астыў мой горан,
Мне работы мала.
Быў раней каваль Абрамча,
І яго не стала».
У матросаў—патранташы,
Шашкі ўніз звісаюць,
А на шапках-бесказырках
Ярка зоркі зззяюць.
Падбягаю я да кузні,
Станаўлюся к тыну:
«Нацягні ты нам, Абрамча,
На тачанкі шыны.
На тачанках мы паставім
Кулямётаў пару.
Шчасце, волю мы здабудзем,
Будзем гаспадарыць»...
І куе каваль Абрамча
З адмысловай сталі:
«Хай зірне на шыны Ленін,
Паглядзіць хай Сталін.
І яшчэ прашу, браточкі, —
Спежкі не мінайце.
Мо' каваць вам зброю трэба —
У кузню забягайце».
Я ніколі не забуду
Шчаснай той хвіліны,
Як Абрамчу памагаў я
Выгінаці шыны.

З яўрэйскай мовы пераклаў

А. БЯЛЕВІЧ.

АД РЭДАКЦЫІ: Верш «Каля кузні два матросы» друкуецца другі раз. Пры першым друкаванні па недагляду карэктуры былі дапушчаны пропускі.

Скульптуры Леніна і Сталіна

У гарадскім садзе імя Чэлюскінцаў у гор. Бабруйску ўстаноўлены скульптуры В. І. Леніна і І. В. Сталіна — работы маскоўскіх скульптараў.

Скульптуры ўстаноўлены на высокіх пастаментах паміж двума вялікімі кветнікамі. Вышыня скульптур — 3,5 метра.

Н. І. УСАЎ.

Фестываль музыкі ў калгасах

Менскі абласны Дом народнай творчасці арганізуе сіламі калектываў мастацкай самадзейнасці фестываль музыкі ў калгасах.

У фестывалі прымуць удзел 10 калектываў і 20—25 салістаў.

Сярод калектываў — хор і джаз клуба металістаў, ансамблі песні і пляскі клуба будаўнікоў і групкома цырульнікаў, хор фабрыкі «КІМ», духавы аркестр клуба настаўнікаў, танцавальны калектыў фабрыкі імя Кагановіча і інш.

У ліку салістаў — інструктар друкарні імя Сталіна тав. Бакшт, салістка хора клуба металістаў тав. Прыходзька, работніца фабрыкі імя Кагановіча, тав. Куніцкая, вучаніца 10 класа 3-й сталінскай школы Егудкіна і інш.

Фестываль пачнецца 15 чэрвеня і прадоўжыцца да 1 жніўня. Канцэрты адбудуцца ў калгасах 9 пагранічных раёнаў.

„ЧАЛАВЕК У ФУТЛЯРЫ“

Новы фільм кіностудыі „Совецкая Беларусь“

«Чалавек у футляры»—чацвертая карціна, пастаўленая студыяй «Совецкая Беларусь» па творах А. П. Чэхава за апошнія два годы. Такая павышаная цікавасць да спадчыны вялікага мастака-рэаліста не выпадковая. Совецкі глядач даўно меў права патрабаваць увасаблення незабыўных чэхаўскіх вобразаў на экране. Яны прасякнуты такой глыбокай жыццёвай сілай, што будуць жыць яшчэ доўгія годы, пакуль канчаткова не выкараніцца пошласць, ханжаства, абмежаванасць і крывадушнасць. У барацьбе з гэтай агіднай спадчынай капіталізма класічныя вобразы А. Чэхава не раз будуць выкарыстаны ў якасці вострай і магутнай зброі.

В. І. Ленін надзвычай высока цаніў сілу чэхаўскіх вобразаў. У артыкуле «Сацыял-дэмакратычная душачка» Владзімір Ільіч назаўсёды закляйміў прадажную сутнасць меншавікоў імем чэхаўскай Оленькі, лёгка мяняўшай свае пераконанні.

Яшчэ пры жыцці А. Чэхава Владзімір Ільіч выкарыстаў вобраз «чалавека ў футляры» для знішчальнага параўнання з ім царскай бюракратыі. І. В. Сталін у нашы дні параўнаў лідэраў і правадыроў правай апазіцыі з чэхаўскім Белікавым. Усё гэта пацвярджае глыбокую жыццёвую тыповасць бяссмертных вобразаў А. Чэхава.

Але адсюль вынікае і другі вывад: як тонка і асцярожна трэба карыстацца гэтымі вобразамі, калі ідзе пытанне аб іх экранізацыі. Каб перанесці іх на экран такімі, якімі яны напісаны А. Чэхавым і ўяўляюцца ў свядомасці народа, трэба вельмі глыбока разумець А. Чэхава і валодаць самым тонкім пачуццём меры.

І вось гэта пачуццё не заўсёды было верным рэжысёру Анненкаву. Калі ён надзіва па-майстэрску валодае ім у абрысоўцы дэталей і прыватнасцей жыцця другарадных герояў, дык у трактоўцы асноўнага вобраза апавядання — настаўніка Белікава — яно адмовіла пастаноўшчыку. Тут з самага пачатку ў рэжысёра было **прынцыпова** няправільнае разуменне вобраза, якое калі і не ідзе ў разрэз, дык ва ўсякім выпадку не сугучна з творчым замыслам А. Чэхава.

Успомнім, як характарызуе вобраз Белікава сам А. Чэхаў: «...Рачаіснасць раздражняла яго, палохала, трымала ў пастаяннай трывозе... Сваімі ўздыхамі, ныццём, сваімі цёмнымі акулярамі на бледным маленькім твары,—ведаеце, маленькім твары, як у тхора,—ён душыў нас усіх... прыгнятаў нас сваёй асцярожнасцю, мніцельнасцю...»

Белікаў А. Чэхава—гэта чалавек, адарваны ад жыцця і запалоханы ім. Яго славутае «як-бы чаго не выйшла» выражала не перасцярогу, а страх перад жыццём, ад якога ён хаваўся ў футляры. Ён жыў у асяроддзі людзей, якія не так адкрыта, але таксама баяліся жыцця, дрыжалі перад ім. Даволі было аднаго такога чалавека, як Белікаў, каб гэты страх зрабіўся зусім адкрытым.

Вось тут трэба было шукаць ключ к правільнаму разуменню вобраза Белікава.

Рэжысёр спрасціў сваю задачу. Правільней, не столькі спрасціў, колькі апрасціў. У адным месцы апавядання Белікаў пргразіў настаўніку Каваленка пераказаць дырэктару гімназіі змест іх гутаркі. Рэжысёр зразумеў гэта як данос. Вось адсюль рэжысёр і пачаў тлумачыць вобраз Белікава.

Белікаў злавесным ценем ідзе па амфіладзе актавага зала гімназіі з запісной кніжкай у руцэ. Самы нязначны ўчынак гімназіста запісваецца ў кніжку. У часе малітвы гімназіст нешта рысаваў. І гэта вырашыла не толькі яго кар'еру, але і жыццё. Па настаянню Белікава, гімназіста выключаюць з гімназіі і ён канчае жыццё самагубствам. Усе астатнія вучні любілі гэтага вучня, але Белікаў перасцярог: «Як-бы чаго не выйшла». Не апасенне выказаў, а іменна перасцярог, даўшы гэтым зразумець, што ён знаходзіцца ў пэўнай сувязі з «вышэйшымі сферамі», г. зн. проста даносіць усё, куды належыць. Настаўнікі баяліся яго, як шпіёна, і прымушаны былі выключыць вучня з гімназіі.

У карціне Белікаў таксама душыць усіх, але не мніцельнасцю і страхам перад усім, а пагражаючымі перасцярогамі. Дырэктар гімназіі адкрыта гаворыць аб сувязі Белікава з «вышэйшымі сферамі» і таму баіцца Белікава. І тут рэжысёр двойчы ўпадае ў памылку. Першая памылка — уяўленне аб Белікаву, які рабіў уплыў на акружаючых больш адміністрацыйнымі пагрозамі, чым малядушнасцю. Другая памылка вынікае з першай. Рэжысёр процістаўляе Белікава яго асяроддзю. З аднаго боку—разумныя прагрэсіўныя інтэлігенты, выхаваныя на Тургеневу і Шэкспіру, з другога—даносчык Белікаў, якому яны паддаюцца, баючыся трапіць у апалу. На самой-жа справе ўсе яны таксама, па сутнасці, людзі ў футлярах. Розніца толькі ў тым, што Белікаў больш адкрыта хаваецца ў свой футляр, таму што ён больш малядушны і адарваны ад жыцця. *Рэжысёр не* здолеў праз вобраз паказаць асяроддзе, і наадварот. А апавяданне А. Чэхава дае для гэтага выключныя магчымасці. І вось, калі прачытаеш апавяданне і прагледзіш карціну, застаецца прыкрае ўражанне, што маленькага, запалоханага, «з тварам тхора», Белікава падмянілі Прышыбеевым. А гэта-ж не ўсё адно, не гледзячы нават на тое, што Прышыбееў таксама перасцерагаў і пагражаў даносамі вышэйшаму начальству.


Не зусім удалым быў і выбар актора на ролю Белікава. Высокая, грузная фігура нар. арт. СССР Хмелёва ніяк не вяжацца з уяўленнем аб Белікаву па апавяданню.

Глыбокая таленавітая ігра Хмелёва, накіраваная на выяўленне дэманічнага каларыту вобраза, яшчэ больш паглыбляе памылковую ўстаноўку рэжысёра.

Але рэжысёр здолеў выключна ярка перадаць некаторыя дэталі і вобразы акружаючага Белікава асяроддзя, атмасферу быту чэхаўскіх герояў. У гэтым плане ў карціне многа яркіх, незабыўных эпізодаў. Пасяджэнне педагагічнага совета, імяніны ў інспектара, памінкі, пасобныя вобразы настаўнікаў гімназіі—пададзены правільна, разумна і таленавіта. У гэтым асноўная заслуга акцёраў. У карціне прымае ўдзел выдатны акторскі склад. Засл. арт. Жараў (Каваленка), нар. арт. Андроўская (Варанька), нар. арт. Гардзін (дырэктар гімназіі), засл. арт. Абдулаў (настаўнік матэматыкі), нар. арт. Раneўская (жонка інспектара) і іншыя стварылі сваёй майстэрскай ігрой уражанне безвыходнай будзённай шэрасці і нуднага існавання чэхаўскіх герояў.

Але, наперакор А. Чэхаву, рэжысёр і тут хацеў знайсці «промень святла», зрабіўшы вобраз настаўніка Каваленка выганнікам. Наўрад, ці трэба было так «дапаўняць» А. Чэхава. Не толькі настаўнік Каваленка, але і ўсе астатнія вобразы чэхаўскіх інтэлігентаў не ўздымаліся да такога сацыяльнага пратэсту і саркастычнай нянавісці да акружаючага, як гэта пададзена рэжысёрам у вобразе Каваленка.

Н. ГУБАРЭВІЧ.



Кіно-студыя ордэна Леніна «Мосфільм» рыхтуе новы мастацкі фільм «Трактарысты» па сцэнарыю ордэнаносца Е. Памешчыкава. Рэжысёр—ордэнаносец І. Пыр'еў. **На здымку:** кадр з фільма. Артыстка ордэнаносец М. Ладыніна у ролі Мар'яны.

Зварот ансамбля беларускай песні і пляскі

Сёння з гастрольнай паездкі па Узбекістану вяртаецца у Менск ансамбль песні і пляскі Дзяржаўнай філармоніі БССР. За час гастролей у Узбекістане ансамбль даў 30 канцэртаў, з іх 7 у парадку шэфства, для часцей Чырвонай Арміі.

Ансамбль наведаў Ташкент, Самарканд, Коканд, Андзіжан і Фергану. Ва ўсіх гарадах ансамблю наладжваліся цёплыя сустрэчы. Адбыліся таксама творчыя сустрэчы з узбекскімі ансамблямі. На адной з такіх сустрэч прысутнічала народная артыстка Узбекскай ССР Тамара Ханум, якая выканала некалькі беларускіх песень.

Выступленні ансамбля беларускай песні і пляскі мелі вялікі поспех.

Зараз ансамбль будзе рыхтавацца да канцэртаў фестываля музыкі ў калгасах, які адбудзецца з 1 па 16 ліпеня. Пасля гэтага ансамбль пачне падрыхтоўку да выступленняў на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Аздаравіцельныя мерапрыемствы для работнікаў мастацтваў

Беларускі камітэт профсаюза работнікаў мастацтваў асігнаваў 200 тысяч рублёў на аздаравіцельныя мерапрыемствы для работнікаў мастацтваў. На працягу лета 11 работнікаў мастацтваў паедуць на курорты ўсесаюзнага значэння, 32 чалавекі—ў санаторыі мясцовага значэння, 177 чалавек—у дамы адпачынку БССР.

Значная дапамога будзе аказана дзецям работнікаў мастацтваў. 50 дзяцей работнікаў мастацтваў будуць накіраваны прафсаюзам у піонерскія лагеры, 6 дзяцей—у санаторыі.

Апрача гэтага, камітэт набыў звыш 30 пуцёвак на курорты ўсесаюзнага значэння для членаў саюза за наяўны разлік.

***

18 чэрвеня ў Дзяржаўнай кансерваторыі БССР заканчваюцца іспыты і пачынаюцца летнія канікулы. Прафком выдаткуе звыш дзесяці тысяч рублёў на арганізацыю летняга адпачынку. 8 студэнтаў накіроўваюцца на курорты, 50 студэнтаў —у дамы адпачынку БССР. Значная частка студэнтаў на працягу канікул будзе карыстацца аднадзённым домам адпачынку.

Поспех хора філармоніі

5 чэрвеня вярнуўся з гастрольнай паездкі па курортах паўднёвага берага Крыма і Паўночнага Каўказа хор Беларускай Дзяржаўнай філармоніі. Хор пад кіраваннем дырыжора І. Г. Бары даў 12 канцэртаў, якія прайшлі з вялікім поспехам.

Закончыліся іспыты у Бабруйскай музычнай школе

З 28 красавіка ў Бабруйскай музычнай школе праходзілі праверачныя іспыты. Яны паказалі, што ў гэтым годзе праводзілася вялікая работа сярод вучняў. Ёсць шмат выдатнікаў. Некаторыя вучні, як Х. Фіш, Ф. Кімельман, Д. Фрыд і інш. за адзін навучальны год закончылі два курсы.

Прыклад выдатнай вучобы паказала 7-мі гадовая скрыпачка Ала Маеўская, якая на «выдатна» здала залікі і пераведзена на другі курс.

23 мая адбыліся іспыты выпускнікоў школы, на якіх прысутнічалі прадстаўнікі менскай кансерваторыі і гомельскага музычнага вучылішча.

І. Ц. СТЭЛЬМАН.

ХРОНІКА

★ 8 чэрвеня закончыў гастролі ў Гомелі Дзяржаўны кіеўскі яўрэйскі тэатр юнага гледача. З 10 чэрвеня тэатр выступае ў Мозыры.

★ Палескі абласны тэатр, які гастраліруе па гарадах і раёнах БССР, зараз працуе ў Магілёве. З вялікім поспехам праходзіць спектакль «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка.

★ Тэатр Юнага гледача імя Н. К. Крупскай рыхтуе прэм'еру—казку «Цудоўная дудка» В. Вольскага. Пастаноўка заслужанага артыста рэспублікі Е. А. Міровіча, мастацкае афармленне—О. П. Марыкса, музыка—кампазітара Н. Шчэглова. Прэм'ера адбудзецца 20 чэрвеня.

★ Тэатр юнага гледача БССР імя Н. К. Крупскай рыхтуе вялікую канцэртную праграму, з якой выедае з 1 па 20 ліпеня на абслугоўванне піонерскіх лагероў.

★ 17 чэрвеня ў Менску пачынае свае гастролі Ленінградскі Дзяржаўны тэатр імя Ленінградскага Совета пад мастацкім кіраўніцтвам заслужанага артыста рэспублікі ордэнаносца С. Е. Радлава.

★ Рэжысёр рускага тэатра БССР тав. Рэшымаў Ю. Н. атрымаў даручэнне паставіць у Рагачоўскім калгасна-соўгасным тэатры пастаноўку «Мой сын» Гергеля і Лігоўскага.

★ З 1 ліпеня на ўсіх прадпрыемствах мастацтваў пачынаецца справаздачна-перавыбарчая кампанія прафсаюзных арганізацый.

★ 12 і 13 чэрвеня канцэртамі саліста Дзяржаўнага ордэна Леніна Акадэмічнага Вялікага тэатра СССР Д. Г. Бадрыдзе Дзяржаўная філармонія БССР закрывае сезон 1938—39 года.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № К—3073.